Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. АЎТОРАК № 106 (28216) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



У чым разынка лідскай пошты?

СТАР. 8



Тэатр для неардынарных дзяцей

СТАР. 11



Быць трэнерам — ягоны лёс

СТАР. 15

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір КАЛТОВІЧ, міністр гандлю:**

*«У краіне будзе створана эфектыўная і цывілізаваная сістэма кантролю за цэнаўтварэннем. Стварэнне адзінага, сістэмнага, самастойнага антыманапольнага органа ў Беларусі заклікана забяспечыць развіццё і абарону канкурэнцыі, развіццё антыманапольнага заканадаўства. Але ключавой задачай была і застаецца абарона ўнутранага рынку на аснове роўнага доступу ўсіх яго ўдзельнікаў і на аснове добрасумленнай канкурэнцыі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 7.06.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19869,00 | ▼ |
| Еўра | 22559,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 302,06 | ▲ |
| Укр. грыўня | 796,19 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

16106

# ШЧАСЛІВАЙ ДАРОГІ!



Фота БЕЛТА.

Беларуская чыгунка адкрыла ў рэжыме падкантрольнай эксплуатацыі рух электрацягнікоў міжрэгіянальных ліній бізнес-класа на ўчастку Гомель—Мінск—Гомель. Перавозка пасажыраў будзе ажыццяўляцца з дапамогай электрацягнікоў серыі ЭПр швейцарскай кампаніі Stadler. На здымку: праваднiца Яна ЦІШКЕВІЧ сустракае пасажыраў першай электрычкі.

## БУДЗЕМ СЯБРАВАЦЬ РЭГІЁНАМІ

Сёння ў Мінску распачынае работу трэці Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі. У ім прымуць удзел і кіраўнікі дзвюх дзяржаў

Чакаецца, што Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 8 чэрвеня выступіць на пленарным пасяджэнні форуму. У гэты ж дзень запланавана двухбаковая сустрэча Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. Прэзідэнты абмяркуюць актуальныя пытанні двухбаковага парадку дня, узаемадзеянне ў інтэграцыйных аб'яднаннях, міжнародную праблематыку.

## ЯК ПЯЛЁСТКІ НА КВЕТЦЫ

У згодзе і разуменні жывуць у нашай краіне прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Гэта яшчэ раз даказаў XI Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур, што прайшоў на выхадных у Гродне. У сваце прынялі ўдзел прадстаўнікі каля 40 нацыянальнасцяў, якія пражываюць у нашай краіне. Яны паказалі свае танцы, песні, кухню, касцюмы на 22 падворках, а таксама канцэртных пляцоўках і імправізаваных сцэнах. На два дні Гродна ператварылася ў сапраўдны вірлівы фестывальны цэнтр краіны. Толькі за першы дзень гасцямі фэсту стала каля 120 тысяч чалавек з розных куткоў Беларусі, суседніх краін і далёкага замежжа!

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

5 разоў на тыдзень!

Пачалася падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2016 года!

Падпісацца на газету можна самымі рознымі спосабамі (нават не выходзячы з дома). Падрабязней пра гэта, а таксама кошт, падпісныя індэксы — на нашым партале zviazda.by.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# Выбары ў Палату прадстаўнікоў адбудуцца 11 верасня

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка 6 чэрвеня падпісаў Указ №190 «Аб назначэнні выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання» і Указ №191 «Аб назначэнні выбараў у Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання», паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Згодна з дакументамі, выбары ў склад палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання пройдуць 11 верасня 2016 года ў Палату прадстаўнікоў, у Савет Рэспублікі — з 18 чэрвеня па 18 верасня 2016 года.

Гэтыя тэрміны вызначаны з улікам патрабаванняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, паводле якой выбары ў новы склад палат парламента назначаюцца кіраўніком дзяржавы не пазней як за чатыры месяцы і праводзяцца не пазней як за 30 дзён да заканчэння паўнамоцтваў гэтых палат дзейнага склікання. Тэрмін паўнамоцтваў Палаты прадстаўнікоў дзейнага пятага склікання заканчваецца 17 кастрычніка 2016 года, Савета Рэспублікі — 18 кастрычніка 2016 года.

На выбарах у Палату прадстаўнікоў будуць дзейнічаць амаль 110 акруговых і 6149 участковых выбарчых камісій (уключаючы 49 за межамі краіны).

Традыцыйна для маніторынгу за выбарамі ў Рэспубліку Беларусь плануецца запрасіць міжнародных назіральнікаў.

Фінансаванне расходаў па падрыхтоўцы і правядзенні названых выбараў будзе ажыццяўляцца за кошт рэспубліканскага бюджэту.

# Задзейнічаць патэнцыял

## Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў даверчыя граматы паслоў 13 дзяржаў

**«З улікам адкрытасці беларускай эканомікі важным фактарам устойлівага развіцця нашай краіны з'яўляецца эфектыўная эканамічная дзейнасць, якая забяспечваецца збалансаванасцю ў знешнім гандлі і ўдзелам у міжнародным падзеле працы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.**

Паводле слоў Прэзідэнта, адной з ключавых мэт эканамічнай палітыкі Беларусі становіцца планамерная дыверсіфікацыя экспарту і раўнамернае размеркаванне гандлёвых сувязяў па трох асноўных напрамках: Еўразійскім эканамічным саюзе, Еўрапейскім саюзе, а таксама партнёрах у Азіі, Афрыцы і Амерыцы. Да 2020 года Беларусь плануе выйсці на прапарцыянальныя суадносіны па кожным з гэтых напрамкаў.

Кіраўнік дзяржавы прыняў даверчыя граматы паслоў Аўстраліі, Ганы, Гвінеі, Зімбабвэ, Рэспублікі Карэя, Нікарагуа, Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, Польшчы, Славакіі, Судана, Філіпін, Эфіопіі і Японіі, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Аляксандр Лукашэнка, у прыватнасці, адзначыў, што Беларусь зацікаўлена ў падтрыманні нарастаючай дынамікі супрацоўніцтва з ЕС. «Гэты год прынёс пазітыўныя зрухі ў нармалізацыі нашых адносін з Еўрасаюзам. Безумоўна, мы зацікаўлены ў максімальным паглыбленні ўзаемасувязяў з ЕС», — заявіў беларускі лідар.

Прэзідэнт таксама бачыць вялікія перспектывы для пашырэння ўзаемадзеяння з дзяржавамі Афрыкі, у дынамічным развіцці якіх Беларусь зацікаўлена. Яшчэ адным з прыярытэтаў у знешняй палітыцы краіны, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, па-ранейшаму з'яўляецца азіяцкі вектар.

Вялікі незадзейнічаны патэнцыял для ўмацавання супрацоўніцтва ў сферы двухбаковага гандлю ёсць і ў адносінах з Аўстраліяй. У роўнай ступені Беларусь разлічвае на развіццё ўзаемадзеяння з краінамі амерыканскага рэгіёна. Надзейным палітычным і эканамічным саюзнікам у Цэнтральнай Амерыцы для Беларусі з'яўляецца Нікарагуа.

Аляксандр Лукашэнка выказаў надзею, што дзейнасць дыпламатаў у Беларусі абернецца адчувальнымі вынікамі, дасць магчымасць знайсці дадатковыя нішы і рэсурсы для ўмацавання гандлёва-эканамічных кантактаў і рэалізацыі значных міжнародных праектаў. «Хачу запэўніць, што з боку беларускіх дзяржаўных органаў і нашых грамадзян вам будуць аказаны ўсебаковая ўвага і садзейнічанне, а для работы будуць створаны самыя спрыяльныя ўмовы. У гэтым вы можаце не сумнявацца», — падкрэсліў Прэзідэнт.

**Сакратарыят Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні саветніку-кансультанту аддзела па рабоце з дакументамі і зваротамі грамадзян Сакратарыята Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Шульгіной Святлане Віктараўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

■ Парламенцкі дзённік

# ЯК РАЗВІВАЕЦЦА ІНСТЫТУТ МЕДЫЯЦЫІ?

## Што варта зрабіць, каб беларусы мірыліся, а не судзіліся

**Закон аб медыяцыі ў нашай краіне — адзін з самых маладых. Яму ўсяго некалькі гадоў, але ўжо можна гаварыць пра вынікі яго ўжывання. Па словах Ліліі МАРОЗ, старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, «круглы стол», які правялі ў верхняй палаце беларускага парламента, прысвечаны практыкі прымянення закона і ацэнцы таго, наколькі інстытут медыяцыі развіты ў Беларусі.**

«Сёння медыяцыя з'яўляецца самым запатрабаваным альтэрнатыўным спосабам вырашэння канфліктаў у свеце: камерцыйных, сацыяльных, працоўных, сямейна-бытавых», — лічыць сенатар. На яе думку, у медыятыўным вырашэнні праблем шмат станоўчага. Па-першае, канфлікт вырашаецца не толькі на юрыдычным узроўні, але і на псіхалагічным. Па-другое, гэта разгружае дзяржаўныя суды.

Праўда, да «прымірыцеляў» сёння звяртаюцца не так часта. На думку **Сяргея ЗАДЗІРАНА, намесніка міністра юстыцыі**, многія грамадзяне не толькі не ведаюць пра «плюсы» паслуг медыятара, але і аб медыяцыі ўвогуле. Таму міністэрства цяпер працуе над пытаннем аб правядзенні маштабнай рэкламнай кампаніі інстытута медыяцыі. «Плануецца запусціць серыю відэаролікаў у эфіры вядучых тэлеканалаў і ў інтэрнэце, а таксама размясціць рэкламу на гарадскіх білбордах і ў грамадскім транспарце. Мы хочам сфарміраваць у грамадзян нейкі візуальны вобраз для ўстойлівага разумення пераваг, якія дае медыяцыя», — адзначыў Сяргей Задзіран.

Плануецца таксама стварыць інтэрнэт-рэсурс, на якім будзе знаходзіцца ўся інфармацыя аб медыятарах і іх дзейнасці. Цяпер такія звесткі ёсць на вэб-партале Міністэрства юстыцыі: інфармацыя пра спецыялізацыю і кантактныя даныя. «Скажам прама, гэтая інфармацыя досыць бедная, таму цяпер мы цалкам падтрымліваем прапанову асобных медыятараў аб стварэнні сайта «Медыятор.бел», — сказаў Сяргей Задзіран.

Рэсурс, які ўжо знаходзіцца ў працэсе распрацоўкі, будзе пабудаваны па прынцыпе самапапаўнення. Кожны медыятар пры жаданні зможа там зарэгістравацца і расказаць пра тое, у якіх сферах ён працуе і як з ім звязацца. На сайце будзе магчымасць перайсці па спасылцы на сайт Мінюста для праверкі статусу медыятара — дзейны ён ці не.

Таксама намеснік міністра расказаў, што ў мінулым месяцы Міністэрства юстыцыі атрымала першую скаргу на дзеянні медыятара. «Не буду агучваць падрабязнасці, паколькі камісія яшчэ пытанне не разглядала. Падзея гэта неадназначная, але ў пэўным сэнсе сведчыць аб развіцці інстытута медыяцыі ў Беларусі», — сказаў ён.

Акрамя таго, у «круглым стале» ўзялі ўдзел члены Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, старшыня Беларускай натарыяльнай палаты, прадстаўнікі Вярхоўнага Суда, Генеральнай пракуратуры, Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

■

# ДАКУМЕНТЫ, АНАЛАГАЎ ЯКІМ НЯМА

## Дэпутат пра значэнне сходу для заканадаўчай улады



**Традыцыйна Усебеларускі народны сход — гэта своеасаблівае падагульненне дасягненняў за мінулую пяцігодку. У кожнай сферы іх дастаткова. У сферы заканадаўства, напрыклад, гэта распрацоўка і прыняцце шэрагу значных законапраектаў — у тым ліку ўнікальных як у маштабах рэгіёна, так і ўсяго свету. Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Наталля ГУЙВІК, член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве, расказала пра тое, чаго чакае заканадаўчая галіна ўлады ад народнага сходу.**

***— Што дэпутаты Палаты прадстаўнікоў пятага склікання лічаць сваім найбольшым дасягненнем?***

— Прэзідэнт падчас Паслання беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу звярнуў увагу, што парламентам пятага склікання на высокім узроўні была праробленa праца па заканадаўчым забеспячэнні развіцця краіны, а таксама рэгламентаваны адносіны, якія раней не мелі комплекснага ўрэгулявання. Былі прыняты абсалютна новыя законы: «Аб медыяцыі», «Аб альтэрнатыўнай службе». Так, цяпер юнакі могуць прызывацца на альтэрнатыўнай аснове ў сувязі са сваімі рэлігійнымі перакананнямі, раней такога не было. Трэба сказаць і пра ўдасканаленне пенсійнай сістэмы, якая даўно ўжо патрабавала рэфармавання.

У эканамічным плане ў нас новыя законы «Аб інвестыцыях», «Аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве», «Аб канцэсіях», «Аб камерцыйнай тайне». Увогуле ж прынята каля 20 зусім новых законаў.

Нельга не згадаць і аб прыняцці шэрагу кодэксаў, якіх у нас раней увогуле не было. Гэта Лясны, Водны кодэксы, рыхтуецца да прыняцця Кодэкс аб культуры. Апошні, дарэчы, з'яўляецца ўнікальным не толькі для нашай краіны, але і для ўсяго свету. Кодэкс аб культуры будзе комплексна рэгуляваць усе пытанні гэтай сферы ў краіне.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў па сваёй ініцыятыве распрацавалі вельмі вялікі праект закона «Аб унясенні змен і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб жывёльным свеце». Таксама дэпутаты пачалі актыўную работу над абсалютна новым праектам закона «Аб абыходжанні з жывёламі». Плануецца разгледзець яго ў першым чытанні ў гэтым месяцы. Скажу, што па абыходжанні з нашымі меншымі братамі можна меркаваць пра ўзровень цывілізаванасці дзяржавы.

Мы распрацавалі і прынялі новы для нашай краіны Закон «Аб медыяцыі». Ён быў прыняты ў 2013 годзе, але ўжо патрабуе ўдасканалення — з улікам практыкі прымянення. Мы ўвогуле шмат працавалі і працуем над аднаўленчым правасуддзем, укараненнем працэсу медыяцыі ў працэс вядзення некаторых крымінальных спраў. Працавалі і над стварэннем фонду аб кампенсацыі матэрыяльнага ўрону па цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынствах, але праз нялёгкі фінансава-эканамічны стан у краіне ініцыятыва пакуль не была рэалізавана.

Імкнёмся прыцягваць да сумеснай працы вучоных. Пры нашай Пастаяннай камісіі па заканадаўстве мы ўпершыню стварылі савет, куды ўваходзяць навукоўцы, практыкі, каб яны маглі дапамагчы нам працаваць над разглядам новых законапраектаў.

Натуральна, вялікі аб'ём дэпутацкай працы — міжнародныя і міжпарламенцкія сувязі.

***— На што трэба будзе звярнуць увагу дэпутатам наступнага склікання?***

— Сапраўды, была зроблена вялікая праца і на будучыню. Шостаму скліканню можна будзе акцэнтаваць увагу не толькі на ўдасканаленні заканадаўства, але і на практычнай працы. Неабходна будзе праводзіць маніторынгі, як прымяняюцца на практыцы прынятыя законапраекты. Інакш мы проста не будзем ведаць, як гэтыя дакументы дзейнічаюць.

Напрыклад, нядаўна дзве камісіі па заканадаўстве — ад Палаты прадстаўнікоў і ад Савета Рэспублікі — правялі «круглы стол», дзе абмеркавалі, як дзейнічае на практыцы «Закон аб медыяцыі», пра які я ўжо згадвала вышэй. З улікам практыкі прымянення былі выпрацаваны новыя прапановы па ўдасканаленні гэтага дакумента, каб нашы грамадзяне больш шырока выкарыстоўвалі медыяцыю ў вырашэнні спрэчак і канфліктаў і менш звярталіся ў суды. Цяпер плануем рыхтаваць праект закона на 2017 год па ўдасканаленні гэтага закона.

***— Якое значэнне мае сход для народных выбраннікаў?***

— Сход для дэпутата — гэта такая ж крыніца інфармацыі, як і звароты выбаршчыкаў. З яе дэпутат бярэ аснову для сваіх заканадаўчых ініцыятыў. Усебеларускі народны сход — гэта такое вялікае інфармацыйнае поле, дзе будуць агучаны праблемы не толькі рэгіянальнага характару, але і ў маштабах краіны, вырашэнне якіх запатрабуе ўдасканалення заканадаўства.

Гэта тычыцца любой галіны: ці то эканомікі, ці то адукацыі, сацыяльнай сферы, вытворчасці. Без заканадаўчага суправаджэння не можа развівацца ні эканоміка краіны, ні іншыя сферы. Таму там будзе выступаць не толькі кіраўнік краіны, які дасць справаздачу за мінулыя пяць гадоў і намеціць мэты і задачы на наступную пяцігодку. Натуральна, паколькі гэта народны сход, будуць выступаць і самі пасланнікі народа — дэлегаты — і казаць пра тое, якім яны бачаць развіццё нашай краіны на працягу наступных пяці гадоў.

Яшчэ раз падкрэслю: задачы, мэты, якія будуць агучаны, запатрабуюць заканадаўчага ўдасканалення.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Тры пытанні да ўлады

# СЭРЦА ГРОДЗЕНШЧЫНЫ



**Лідскі раён па праве лічыцца сэрцам Гродзеншчыны. І не толькі таму, што знаходзіцца ён у цэнтральнай частцы вобласці. Лідчына — адзін з найпрыгажэйшых і найстаражытнейшых куточкаў Беларусі. Яе гісторыка-культурнай спадчыне можа пазайздросціць любы рэгіён. Прамысловы, будаўнічы і сельскагаспадарчы патэнцыялы краю вядомы далёка за межамі нашай краіны. Што робіцца ў рэгіёне, каб і далей паспяхова рушыць наперад, расказаў старшыня Лідскага райвыканкама Міхаіл КАРПОВІЧ.**

***— Міхаіл Канстанцінавіч, што цікавага ўбачыць сёння турыст, які завітае ў лідскі край?***

— Візітнай карткай горада з'яўляецца замак XIV стагоддзя, архітэктурная і гістарычная каштоўнасць якога ўяўляе міжнародную значнасць. Ёсць у рэгіёне і помнікі архітэктуры нацыянальнага значэння: касцёл Узвіжання Святога Крыжа, Архістратыга-Міхайлаўскі кафедральны сабор, Міхайлаўскі касцёл у вёсцы Белагруда, будынак пошты.

Ужо добрай традыцыяй стала правядзенне ў раёне культурных мерапрыемстваў з выкарыстаннем гісторыка-культурнай спадчыны. Найбольшай папулярнасцю сярод жыхароў і гасцей горада карыстаецца рыцарскі турнір «Меч Лідскага замка», гістарычныя імпрэзы з удзелам рыцарскіх клубаў, народнае свята «Купалле» каля сцен Лідскага замка, Калядны фэст у Лідскім замку, музычныя вечары і тэатральныя паказы.

У раёне створаны ўсе ўмовы для культурнага адпачынку. Нашы творчыя калектывы працуюць у аграсядзібах, санаторыях, свае работы прадстаўляюць рамеснікі, ва ўстановах адкрыты крамы па продажы сувенірнай прадукцыі. Падчас турыстычнага маршруту «Жыццё і творчасць Валянціна Таўлая ў нашым горадзе» прапануем наведаць хату, дзе жыў паэт, друкарню і рэдакцыю, дзе ён працаваў. Карыстаецца папулярнасцю турыстычны маршрут «Хрысціянскія святыні горада Ліды» — пешаходная экскурсія працягласцю ў 4 кіламетры, падчас якой можна азнаёміцца з храмамі горада. У Лідскім замку паспяхова працуюць праекты Лідскага гісторыка-мастацкага музея, якія спрыяюць папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны і развіццю ўязнога турызму.

Шмат мерапрыемстваў адбываецца і ў сельскай мясцовасці. Напрыклад, распрацаваны культурна-турыстычны маршрут «Ад Ліды да Бердаўкі», які ўключае наведванне Бердаўскага цэнтра культуры і вольнага часу, які размяшчаецца ў былым палацы Аляксандра Дамбавецкага. Турыстам прапануецца праграма, якая аднаўляе гісторыка-культурную сітуацыю XIX стагоддзя, пры гэтым гледачы становяцца непасрэднымі ўдзельнікамі інтэрактыўнага працэсу.

***— Адметны рэгіён і на прамысловай карце Беларусі. Якія прадпрыемствы ўтвараюць эканоміку Лідчыны, можа быць, нават краіны?***

— Сучасная Ліда — гэта найбуйнейшы прамысловы цэнтр Гродзенскай вобласці. Лідарам рэгіёна з'яўляецца прамысловы комплекс. Сельская гаспадарка выступае яго платформай і займае важнае месца ў эканоміцы. Яскравым пацвярджэннем выніковай работы па развіцці прамысловасці стала адкрыццё новых заводаў і вытворчасцяў. Сярод іх — завод металатканых сетак «ХАВЕР-бай», макаронная фабрыка на прадпрыемстве «Лідахлебапрадукт», завод гарачага ацынкавання «Конус», вытворчасць шклаваты на шклозаводзе «Нёман». Далёка за межамі краіны вядомая прадукцыя такіх арганізацый раёна, як «Лідская мука», «Лідскае піва», «Лідская лакафарба», «Лідкон», «МіЛіда», «Лідскія аўтобусы». Прадпрыемствы машынабудавання — «Лідсельмаш», «Лідаграпраммаш» і «Мінойтаўскі рамонтны завод» — маюць больш чым паўвекавы досвед па выпуску перадавой сельскагаспадарчай тэхнікі.

***— Неўзабаве краіна адзначыць сумную дату — 75-годдзе пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Колькі ветэранаў жыве ў Лідскім раёне, якім чынам аб іх клапоціцца ўлада і ўвогуле, што робіцца ў рэгіёне ў справе захавання памяці?***

— У цяперашні час у Лідскім раёне пражывае 78 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Штогод у вяснова-восеньскі перыяд праводзіцца абследаванне гэтай катэгорыі грамадзян спецыялістамі тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, ваеннага камісарыята, медыцынскімі работнікамі, службай МНС, ЖКГ і іншымі арганізацыямі. Усе выяўленыя заяўкі і прапановы па аказанні дапамогі ў рамонце жылых памяшканняў, добраўпарадкаванні двароў і пасадцы агародаў выконваюцца ў самыя кароткія тэрміны. Толькі за студзень — май гэтага года рэалізавана 148 заявак. За ўсімі ветэранамі Вялікай Айчыннай замацаваны прадпрыемствы горада і раёна, якія ведаюць іх надзённыя праблемы, дапамагаюць вырашаць іх. Напрыклад, да Дня Перамогі прадпрыемствамі і арганізацыямі Лідскага раёна ім аказана рознага віду дапамога на суму 92,8 мільёна рублёў.

На тэрыторыі Лідскага раёна знаходзіцца 79 мемарыяльных дошак, помнікаў, абеліскаў, брацкіх магіл воінаў, падпольшчыкаў, партызан, мірных жыхароў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, воінаў-інтэрнацыяналістаў. Усе яны замацаваны за 80 прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі Лідчыны, якія адказваюць за іх добраўпарадкаванне.

У мэтах захавання памяці аб тых падзеях на працягу ўсяго года ў памятныя дні і даты праводзяцца мітынгі з удзелам грамадскасці, урачыстыя мерапрыемствы. У навучальных установах — тэматычныя заняткі, прысвечаныя Дню Перамогі, сустрэчы з ветэранамі Узброеных Сіл Беларусі.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

■ Мінулае — будучае

# ПРЫСТАНЬ, БРАМА І МУЗЕЙ

## У Магілёве прэзентавалі канцэпцыю забудовы Пакроўскага пасада

**Гэта адзін са старэйшых куточкаў горада, які пачаў актыўна развівацца ў XVI стагоддзі. Назву тапоніму дала Узнясенска-Пакроўская царква, якая калісьці тут размяшчалася. Пазней гэтую частку сталі называць яшчэ і Школішчам — бо ў XVII стагоддзі тут узводзяцца драўляная халодная сінагога і ешыва — яўрэйская рэлігійная ўстанова адукацыі. Квартал паступова становіцца цэнтрам рэлігійнага яўрэйскага жыцця.**

Зараз гэтае месца ў стадыі будаўніцтва — на тэрыторыі ствараецца гарадскі парк адпачынку, а побач вядзецца рэканструкцыя Дняпроўскага моста. Мясцовыя ўлады зацікаўлены, каб зрабіць гістарычны куточак ля Дняпра сапраўдным упрыгажэннем Магілёва.

Аўтарскі калектыў **Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры** дасканала вывучыў архіўныя матэрыялы і планы забудовы гістарычнага месца. Матыў — зрабіць яго як мага больш зручным для гараджан і цікавым для турыстаў.

У мінулыя стагоддзі прадмесце знаходзілася за межамі гарадскіх абарончых умацаванняў і сувязь з ім ажыццяўлялася праз браму. Сучасны яе варыянт ёсць і на эскізе распрацоўшчыкаў канцэпцыі. На погляд старшыні таварыства Антона Астаповіча, было б лагічна, каб падчас рэканструкцыі прылеглай да моста тэрыторыі зрабіць падземны пераход у выглядзе брамы. Па-першае, можна будзе адразу ж з плошчы Славы спусціцца да Дняпра, па-другое, гэта своеасаблівы напамін пра тую браму, якая тут калісьці была.

Што датычыцца самой тэрыторыі Пакроўскага пасада, то аўтары канцэпцыі прапаноўваюць падзяліць яе ўмоўна на тры часткі. Бліжэйшая да Дняпра, на іх погляд, падыходзіць для размяшчэння порта і прыстасаванай для адпачынку набярэжнай. Як варыянт, прапануецца аднавіць цікавы па архітэктуры будынак партовага склада і адкрыць у ім музей воднага транспарту. Па суседстве (гэта частка № 2) няблага будуць глядзецца культавыя пабудовы. Узнясенска-Пакроўскую царкву, падмуркі якой былі тут знойдзены, ужо аднаўляюць. Калісьці Пакроўскі пасад упрыгожвалі касцёл у гонар святога Антонія і кляштар бернардзінцаў. Іх распрацоўшчыкі лічаць патрэбным таксама аднавіць. Трэцюю частку прапаноўваецца перадаць пад шэраговую забудову вышынёй не больш за 3 паверхі — жылыя дамы, аб'екты грамадскага харчавання, офісы і гэтак далей.



Канцэпцыя мае права на жыццё, лічаць магілёўскія гісторыкі. Ім спадабалася, што аўтары пастараліся захаваць гістарычную частку і добра спалучылі яе з сучаснымі патрэбамі горада. Засталіся пытанні, як гэта будзе стасавацца з іншымі будынкамі і як ва ўсё гэта «ўпішацца» парк.

Антон Астаповіч падкрэсліў, што прадстаўленая канцэпцыя — гэта не канчатковы варыянт. Для стварэння праекта неабходна правесці археалагічныя даследаванні і шэраг іншых працэдур. Пакуль зроблена інвентарызацыя таго, што на гэтым месцы ёсць на сённяшні дзень. Цяпер трэба думаць, як правільна гэта выкарыстаць. Наперадзе — разгляд канцэпцыі з больш вузкімі спецыялістамі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Падпіска-2016

## ШЧЫРА, ПА-ЗВЯЗДОЎСКУ

Звязда. Да чытача з любоўю!

На гэтым тыдні крыху пахадалала, аднак капрызы надвор'я, зразумела, зусім не паўплывалі на актыўнасць нашых падарожжаў па роднай Беларусі. Геаграфія сустрэч звяздоўцаў са сваімі чытачамі ўвесь час пашыраецца. Мы прыязджаем да вас у госці, а вы нас чакаеце з нецярплівасцю і сустракаеце, быццам даўніх знаёмых і добрых суседзяў. Вядома, гэта так і ёсць, паколькі журналісты — людзі неабыякавыя, няўрымслівыя і захопленыя сваёй любімай справай, гатовыя пры неабходнасці прыйсці на дапамогу. Нездарма нас называюць чацвёртай уладай.

Як паказвае практыка, цікавасць да «Звязды» ў самых розных кутках Беларусі вялікая. Людзі чытаюць нашу газету, падпісваюцца на яе, прапануюць зрабіць гэта сваім родным і знаёмым. Атрымліваецца такая своеасаблівая звяздоўская сацыяльная сетка, праўда, з адной значнай адметнасцю — мы сустракаемся і размаўляем не праз інтэрнэт, а гледзячы адзін аднаму ў вочы. Па-людску.

І сустрэчы са сваімі чытачамі (не толькі з цяперашнімі, а і з тымі, хто мяркуе імі стаць) мы працягваем і надалей. На мінулых выхадных пабылі ў Гродне, учора — на Гомельшчыне, а **сёння рушым на Магілёўшчыну. Сустрэчы адбудуцца ў самабытным і працавітым краі — на Дрыбіншчыне. 7 чэрвеня Дзень падпісчыка газеты «Звязда» з 11 да 14 гадзін пройдзе на раённым вузле паштовай сувязі. Завітайце — будзе шчыра, па-звяздоўску!**

■ Надвор'е

# ПАСВЯЖЭЛА ДАВОЛІ РЭЗКА

## Сіноптыкі адзначаюць, што сярэднясутачная тэмпература на гэтым тыдні будзе на 2-4 градусы ніжэйшай за норму

**А ўвогуле на тэрыторыі Беларусі гэтымі днямі ўсталюецца няўстойлівае надвор'е, якое прынясуць да нас паўночныя ветры, паведамляе начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Чакаецца, што ў першай палове тыдня ў нас будзе гаспадарыць зона павышанага атмасфернага ціску, якая была сфарміравана ў халоднай паветранай масе. Аднак моцныя дажджы, як у краінах Еўропы, у Беларусь не прыйдуць. Справа ў тым, што на тэрыторыю нашай краіны моцныя ападкі не пускаюць халодныя антыцыклоны. Таму на гэтым тыдні будзе халаднавата, а больш цёплае, летняе надвор'е вернецца бліжэй да сярэдзіны чэрвеня, лічаць спецыялісты.

А сёння ў краіне будзе пераважна без ападкаў. Максімальная тэмпература паветра складзе ад 14 да 20 цяпла. Ужо ў сераду месцамі, пераважна па паўночнай палове краіны, пройдуць кароткачасовыя дажджы, а ўдзень магчымы навальніцы. Уначы будзе даволі холадна, калі тэмпература паветра знізіцца да 2—9 цяпла, але ўдзень прагназуецца плюс 17—23 градусы, а па паўднёвым захадзе — да 25 цяпла. Сіноптыкі прагназуюць, што ў чацвер праз тэрыторыю Беларусі будзе перамяшчацца з Балтыйскага мора атмасферны фронт, які прынясе на большую частку краіны кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература паветра ўначы крыху павялічыцца і складзе плюс 6—13 градусаў, удзень будзе ад плюс 13 да плюс 20 градусаў, а па паўднёвым усходзе — да 23 цяпла. Кароткачасовыя дажджы і навальніцы прагназуюцца і ў пятніцу. Тэмпература паветра ўначы чакаецца ў межах ад 4 да 9 цяпла, па паўднёвым усходзе — да плюс 12 градусаў, удзень — плюс 14—21.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, халоднае надвор'е захаваецца і ў выхадныя. Чакаецца, што ў суботу ўначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 5—12 цяпла, удзень будзе ад плюс 12 да плюс 19 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# НА «ГРОДНА АЗОТ» ЗАГІНУЛІ ДВА РАБОЧЫЯ

## Яшчэ два работнікі шпіталізаваныя

Па інфармацыі **прэс-сакратара Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Наталлі Жывалеўскай**, аварыя адбылася ў цэху аднаўлення едкага натру. Мяркуецца, што трагедыя здарылася падчас правядзення агнявых работ, калі іскра патрапіла на гідраксіламінсульфат. Пачался тэрмічнае раскладанне рэчыва, што суправаджалася задымленнем. У выніку два рабочыя памерлі з-за атручэння парамі, а два былі шпіталізаваныя. На прадпрыемстве працавала 16 адзінак тэхнікі МНС, ратавальнікі падавалі ваду для ахаладжэння канструкцый цэха і асаджэння прадуктаў раскладання. Эвакуацыя на прадпрыемстве не праводзілася, небяспекі для жыцця рабочых няма.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

Утерянный представительством Белгосстраха по Первомайскому району г. Минска БЛАНК СТРАХОВОГО ПОЛИСА по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ №1699208 **считать недействительным.** УНП 100122726

# ЯК ПЯЛЁСТКІ НА КВЕТЦЫ



## Застанецца музей...

Адгрымелі канцэрты на фестывальных сцэнах; яркае шэсце ўдзельнікаў, якое прадстаўляла не толькі касцюмы, але і песні, танцы, нацыянальныя тэатральныя формы, застаецца толькі яскравым успамінам і згадкай, што можа быць узноўленай па фотаздымках. З фестывалямі нацыянальных культур развітвацца заўсёды сумна, бо кожны з іх, хоць традыцыйны і багаты на завядзёнкі, з'яўляецца непаўторным і глыбока індывідуальным паводле атмасферы. Сёлетні фестываль яго ўдзельнікам і гасцям запомніцца добразычлівымі ўсмешкамі, гасціннасцю гарадзенцаў, надзвычай багатай праграмай (паспець усё пабачыць і пачуць было амаль немагчыма!), разнастайнасцю рамесніцкіх вырабаў, прадстаўленых на выстаўцы-продажы «Горад майстроў запрашае на кірмаш».




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Але XI Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур пакінуў па сабе ў старажытнай Гародні і матэрыяльныя сведчанні памяці. Адно з іх — музей фестывалю, што распачаў працу ў СШ №8. Яго стваральнікі лічаць, што гісторыя фестывалю павінна быць вядомая не толькі яго арганізатарам і пастаянным удзельнікам, але і ўсім жыхарам горада, яго гасцям.

Падчас адкрыцця музея фэсту **намеснік старшыні Гродзенскага гарвыканкама Зоя КУЛЕША заўважыла:**

— Адкрыццё музея Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур — падзея доўгачаканая і вельмі важная. Фестываль мае дваццацігадовую гісторыю, таму стварэнне яго музея было проста неабходнасцю. Пакуль экспазіцыя размясцілася ў СШ №8 горада Гродна, яна распавядае пра гісторыю фэсту, але я перакананая, што з кожным наступным фестывалем фонды музея будуць папаўняцца і, магчыма, з цягам часу музей адзначыць наваселле ў гістарычным цэнтры горада, атрымае сталую прапіску ў асобным старажытным будынку. Спадзяюся, яго фонды стануць карыснымі парадамі для тых, хто будзе ладзіць фэст пасля нас.

Адметна, што новы музей — другі ў нашай краіне, які прысвечаны асобнаму фестывалю. Летась была адкрыта экспазіцыя пра пастаўскі фэст «Звіняць цымбалы і гармонік», але відавочна, што музей фэсту нацыянальных культур мае намнога большы патэнцыял для пашырэння. Ужо сёння экспазіцыя налічвае каля дзясятка стэндаў, яны расказваюць пра гісторыю фестывалю і нацыянальнасці, якія пражываюць на Беларусі. Ёсць тут калекцыя сувеніраў з папярэдніх фэстаў, а таксама фігуры-сімвалы, якія штогод атрымліваюць дыяспары-ўдзельнікі свята.

Нават у дзень адкрыцця фонды гэтага ўнікальнага музея папоўніліся новымі прадметамі. Так, Зоя Кулеша перадала сімвал сёлетняга фестывалю — шклянога бусла, які ўзлятае. А **намеснік старшыні Беларускага фонду культуры**, адзін з арганізатараў самага першага фестывалю нацыянальных культур, які прайшоў у Гродне ў 1996 годзе, **Тадэвуш СТРУЖЭЦКІ** перадаў фільм пра першы фэст. Тадэвуш Іванавіч сказаў:

— Я вельмі рады, што спраўджваецца мая мара аб стварэнні музея фестывалю нацыянальных культур. У 1994 годзе, калі фэст толькі задумваўся, яго арганізатары былі ўпэўнены ў тым, што свята стане адным з самых яркіх, прыгожых і адметных у нашай краіне. Так і адбылося. Больш за тое, ён атрымаўся яшчэ і самым дынамічным, бо творчыя рэсурсы свята вельмі значныя, і за дваццацігоддзе існавання фестывалю яны не раскрытыя.

Так, калі звярнуцца да гісторыі, то ў першым фестывалі прымалі ўдзел прадстаўнікі толькі 11 нацыянальных аб'яднанняў, тады не ўсе з іх мелі свае творчыя калектывы. Вынікі дваццацігоддзя існавання фестывалю сапраўды ўражваюць: аб сабе заявіла многа новых нацыянальнасцяў, былі створаны творчыя калектывы, якія надзвычай высока ўзнялі свой узровень выканання, многія наблізіліся да прафесійных.

Думаецца, адной з традыцый фестывалю нацыянальных культур можа стаць і папаўненне яго музея творчымі прадметамі, цікавымі рэчамі ад удзельнікаў. Жывы, дынамічны музей мае ўсе магчымасці для развіцця і пашырэння, ён можа стаць адным з самых цікавых музеяў у горадзе, прывабліваць гасцей з іншых краін. Толькі ўявіце: адно наведванне музея фестывалю можа даць уяўленне пра нацыянальнасці, якія пражываюць на тэрыторыі нашай краіны, і іх культуру, традыцыі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*




## ...і старажытная ладдзя

Пачаткам яшчэ аднаго важнага праекта, на гэты раз турыстычнага, стала адкрыццё падчас фестывалю нацыянальных культур скульптуры-сімвала на беразе Нёмана, непадалёк ад Старога і Новага замкаў. Фігура ладдзі-насада з'явілася на беразе магутнай ракі не выпадкова. На такіх ладдзях у XII стагоддзі нашы продкі рухаліся па хвалях Нёмана, а ў XXI стагоддзі яна можа стаць турыстычным брэндам Гродна. Мяркуецца, што адкрыццё скульптуры паслужыць стартам для важных праектаў і рашэнняў, сімвалам дружбы народаў і краін. Урачыстую цырымонію прадстаўлення ладдзі публіцы правёў **старшыня Гродзенскага гарвыканкама Мечыслаў ГОЙ**. Ён падкрэсліў:

— Нам прырода падарыла ўнікальную раку Нёман. Ужо дзевяць стагоддзяў таму яна была асноўным гандлёвым шляхам для нашых продкаў. На жаль, сёння раку ў такіх мэтах мы амаль не выкарыстоўваем, не развіваем яе экскурсійны і турыстычны патэнцыял. А яна можа быць карыснай для горада, рэгіёна і суседніх дзяржаў. Літаральна на мінулым тыдні мы праплылі па Нёмане ад Гродна да літоўскага Друскенінкая, усё атрымалася. Спадзяёмся, што гэты сімвалічны жэст стане пачаткам добраўпарадкавання ракі, набыцця новых суднаў для ажыццяўлення трансгранічнага супрацоўніцтва.

Скульптура ладдзі стала доказам пераемнасці пакаленняў, захавання памяці пра традыцыі краю праз гады і стагоддзі. У цырымоніі адкрыцця фігуры таксама прынялі ўдзел намеснік старшыні Рэспубліканскага турысцка-спартыўнага саюза Сяргей Каляда і аўтар скульптуры Уладзімір Панцялееў.

Адметна, што старажытная шахматная фігурка, якая натхніла на стварэнне скульптуры, адносіцца да часоў гарадзенскага князя Усеваладкі і княгіні Агаф'і. Менавіта такія ладдзі ў той час забяспечвалі кантроль над рухам гандлёвых судоў па Нёмане. Гэта ўнікальная лодка з двума вострымі насамі магла хадзіць па рацэ і вельмі хутка манеўраваць, рухацца ў абодва бакі, грабцы пры гэтым былі схаваныя пад палубай.

**Жывы, дынамічны музей мае ўсе магчымасці для развіцця і пашырэння, ён можа стаць адным з самых цікавых музеяў у горадзе, прываблiваць гасцей з іншых краін.**

Кіраўніцтва горада плануе, што з часам непадалёк ад скульптуры ладдзі з'явіцца прыстань, а сама фігура стане яшчэ адным пунктам прыцягнення турыстаў. Мечыслаў Гой таксама адзначыў, што сёння Гродну не хапае малых скульптурных формаў, таму час ад часу на вуліцах гэтага старажытнага горада будуць з'яўляцца новыя фігуры. Наступную ўстановяць ужо ў верасні, да Дня горада.



## Яшчэ і ўзімку?

Правядзенне Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур у летнім фармаце — цалкам лагічнае і зразумелае рашэнне, якое за дваццацігоддзе існавання свята сябе апраўдала. Але калі прапанаваць прадстаўнікам розных нацыянальнасцяў якія жывуць у Беларусі, сабрацца ў Гродне ўзімку? А само свята праводзіць як Алімпійскія гульні, летам і зімою? Менавіта такую ідэю выказаў падчас цырымоніі закрыцця фэсту **міністр культуры Барыс СВЯТЛОЎ**. Ён зазначыў:

— На жаль, набліжаецца завяршэнне свята. Мы рыхтаваліся да яго цягам паўгода, і ўсё атрымалася. Чарговы раз фестываль пацвердзіў, што Беларусь — гэта ручнік, дзе могуць вышываць культурныя ўзоры прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў. Таму не дзіўна, што фэст карыстаецца такой папулярнасцю. Ён уносіць значны ўклад у развіццё культуры краіны. Варта было б пашырыць праграму фестывалю і праводзіць свята не толькі летам, але і ўзімку.

І сапраўды, зімовы фармат святкавання паказаў бы наведвальнікам фэсту іншыя аспекты культуры нацыянальнасцяў-удзельнікаў. Гэта не толькі «летні» варыянт баўлення часу ў выглядзе спеваў і танцаў на вольным паветры, але і больш камерныя хатнія зімовыя забавы, напрыклад калядныя гульні ці сямейныя абрады, а таксама іншыя касцюмы і стравы нацыянальнай кухні. Тады і нацыянальныя падворкі маглі б здабыць новы фармат — ператварыцца ў паўнавартасныя хаты ці залы.

Як бы там ні было, шкляныя буслы — сімвалы сёлетняга фэсту (выраблены на шклозаводзе «Нёман» у Бярозаўцы, што на Лідчыне) ужо знайшлі свае гнёзды ў розных кутках Беларусі, пасяліліся ў прадстаўнікоў нацыянальных дыяспар, якія ў згодзе жывуць на нашай зямлі. Мы ж будзем чакаць новай сустрэчы ў старажытным Гродне, і не важна, пройдзе яна ўлетку ці ўзімку, можна быць упэўненымі, што на свяце нацыянальных культур заўсёды будзе валадарыць мір, дружба і згода паміж прадстаўнікамі розных народаў.

**Думаецца, фестываль нацыянальных культур — вялікая радасць і вялікі гонар перадусім для гарадзенцаў. Хлебасольна прыняць, ветліва прывітаць столькі гасцей — праца не з лёгкіх. Але, упэўнена, усё прайшло выдатна. Міліцыянеры былі ветлівымі, жыхары горада ўсмешлівымі, а арганізатары — дасведчанымі і актыўнымі. Пра вынікі правядзення свята расказаў старшыня Гродзенскага гарвыканкама Мечыслаў ГОЙ:**

— Мы разам упрыгожылі горад, каб сустрэць гасцей фестывалю — нашых старых сяброў і новыя дэлегацыі. Дзякую ўсім жыхарам Гродна, якія адгукнуліся на просьбы аб добраўпарадкаванні балконаў, пасадцы кветак. Усе ўдзельнікі фэсту вельмі добра адпачылі, атрымалі задавальненне і ад фестывальнай праграмы, і проста ад сустрэчы з нашым горадам. Я рады, што мы на вельмі высокім узроўні падрыхтавалі свята і прынялі гасцей. Для мяне ж фэст стаў пэўнага кшталту экзаменам, бо яго арганізацыяй я займаюся ўпершыню. І ўсмешлівыя твары людзей на вуліцах горада — найлепшая адзнака, паказчык таго, што свята прайшло добра. Вельмі добрыя водгукі я атрымаў і ад рамеснікаў, яны нават скардзіліся, што часам не хапала вырабаў для продажу. Значыць, у наведвальнікаў фэсту ёсць вялікая цікавасць і да народных рамёстваў.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

■ Разумныя грошы

# У СЕЦІВЕ ЛЕПШ «ЗАСВЕЧВАЦЦА» ПАМЕНЕЙ

## Спецыялісты рэкамендуюць абавязкова выкарыстоўваць у інтэрнэце асобную картку і не «раскідваць» персанальную інфармацыю направа і налева

**У мінулых матэрыялах рубрыкі мы пазнаёмілі чытачоў з пластыкавымі карткамі, а таксама з тым, як з іх дапамогай аплачваць тавары і паслугі ў банкаматах, інфакіёсках, у банках і крамах. Зараз мы пагаворым аб больш складанай працэдуры, якая тычыцца правядзення аперацый безнаяўнай аплаты «пластыкам» у інтэрнэце. І ў гэтым нам дапамагае пакрокавы дапаможнік, распрацаваны Нацыянальным банкам краіны.**

### ТОЛЬКІ ПА ПРАВЕРАНЫХ КАНАЛАХ

Эксперты нацыянальнага фінансавага рэгулятара ўпэўнены, што для аплаты тавараў у сеціве лепш выкарыстоўваць асобную картку (да асобнага рахунку і з абмежаванай сумай грашовых сродкаў на ім), прызначаную толькі для гэтай мэты. Больш за тое, неабходна рабіць пакупкі толькі ў тых інтэрнэт-крамах, якія выклікаюць у вас давер.

Пры выкананні падобных пакупак трэба прытрымлівацца аднаго залатога правіла: нікому не давярaць і не дзейнічаць імпульсіўна. Пра што гэта мы? Ды пра нашу часам празмерную гаварлівасць. А гэта не той выпадак. Спецыялісты ўвогуле раяць не адказваць на электронныя лісты, у якіх ад імя банка або іншых арганізацый, а таксама грамадзян вас просяць даць персанальную інфармацыю, у тым ліку рэквізіты вашай карткі, у мэтах іх абнаўлення або для рэгістрацыі. У гэтым выпадку трэба паспрабаваць высветліць правамернасць такіх прапаноў — звязацца з банкам па дакладна вядомым нумары тэлефона (напрыклад, атрыманаму вамі непасрэдна ад банка, які выдаў картку).

Зламыснікі часта распаўсюджваюць вірусныя праграмы праз розныя інтэрнэт-рэсурсы (ад сацыяльных сетак да звычайных навінавых сайтаў), з дапамогай электроннай пошты і праграм абмену паведамленнямі. Клієнт, камп'ютар якога заражаны, пры спробе ўвайсці ў асабісты кабінет можа непрыкметна перанакіроўвацца на «фішынгавы» сайт, які знешне практычна не адрозніваецца ад сапраўдных сайтаў інтэрнэт-банкаў. Каб гэтага пазбегнуць, трэба максімальна выкарыстоўваць магчымасці свайго браўзера і паштовага кліента па забеспячэнні бяспекі. Для гэтага ў опцыях браўзера і паштовага кліента неабходна ўключыць дадатковыя функцыі. Напрыклад, такой функцыяй будзе «Блакіраванне ўсплываючых вокнаў», «Аварона ад фішынгу і шкоднага ПА», «Адкрываць файлы на падставе змесціва, а не пашырэння» і інш. Таксама не варта карыстацца акном папярэдняга прагляду ў паштовым кліенце.

Акрамя таго, рэкамендуецца заўсёды самастойна ўводзіць вэб-адрас банка (інтэрнэт-банкінгу) у адрасны радок браўзера замест выкарыстання любых гіперспасылак, тым больш з падазроных паведамленняў.

Не залішнім будзе яшчэ раз пераправерыць дакладнасць адрасоў інтэрнэт-сайтаў, да якіх кліент збіраецца падключацца для здзяйснення пакупкі, бо падобныя (крыху змененыя) адрасы могуць быць выкарыстоўвацца для ажыццяўлення неправамерных дзеянняў. Калі ў вас з'явіліся якія-небудзь падазрэнні адносна інтэрнэт-старонкі ці вы не хочаце прадастаўляць персанальныя звесткі або даныя карткі, то пакіньце старонку і ажыццявіце куплю ў іншым месцы.



### ВЫВУЧАЦЬ УМОВЫ ПАГАДНЕННЯ — ДА АПОШНЯЙ КОСКІ

Перад правядзеннем аперацыі аплаты тавару (паслугі) трэба ўважліва вывучыць усе ўмовы прапанаванага пагаднення. У прыватнасці, гэта тычыцца ўсіх правілаў прадастаўлення паслуг, умовы дастаўкі, вяртання, замены тавару, а таксама працэдуры адмены заказу. Асабліва ўважліва неабходна чытаць умовы ажыццяўлення аперацый, звязаных з азартнымі гульнямі (казіно, латарэі), бо менавіта яны могуць прадугледжваць аўтаматычную падпіску на паслугу, а гэта пацягне спісанне грашовых сродкаў на рэгулярнай аснове.

Захоўвайце любыя электронныя дакументы, перапіску па электроннай пошце, якая датычыцца спроб вырашэння спрэчнай сітуацыі з арганізацыяй гандлю (сэрвісу), бо гэтыя звесткі могуць стаць важнымі для абароны вашых правоў спажыўца. Пры немагчымасці самастойна вырашыць спрэчную сітуацыю звярніцеся ў банк, які выдаў картку. У выпадку, калі ўмовы для вас незразумелыя, трэба адмовіцца ад плацяжу. Тут трэба разумець, што вяртанне грашовых сродкаў па праведзеных вамі аперацыях будзе магчымым далёка не ва ўсіх выпадках.

### ПІН-КОД НЕ ПАТРАБУЕЦЦА

Спецыялісты Нацбанка паведамляюць, што ніколі нельга агучваць свой пін-код пры заказе тавараў па тэлефоне ці пошце і ўводзіць яго ў форму заказу на сайце гандлёвага пункта. Пры здзяйсненні аддаленых аперацый увод пін-кода ніколі не патрабуецца.

Пэўныя нюансы існуюць і пры папярэднім браніраванні гасцініцы праз інтэрнэт-сайт. Калі па нейкіх прычынах кліент не плануе скарыстацца ёю, тады неабходна абавязкова ажыццявіць адмену браніравання праз той жа інтэрнэт-сайт згодна з прапісанымі на ім працэдурамі.

Атрыманне кліентам кода адмены браніравання гасцініцы з'яўляецца доказам таго, што бронь сапраўды адменена. У іншым выпадку за несвоечасовую адмену броні гасцініца мае права прадставіць да спісання з вашага рахунку суму грошай ва ўстаноўленым ёю памеры.

### НА ЎЛАСНАЙ ТЭРЫТОРЫІ

Пакрокавы дапаможнік Нацбанка рэкамендуе нам рабіць пакупкі толькі са сваіх электронных прылад і не карыстацца інтэрнэт-кафэ і іншымі агульнадаступнымі сродкамі, дзе могуць быць устаноўлены праграмы-шпіёны, якія запамінаюць уведзеныя пакупніком канфідэнцыйныя звесткі.

Калі банкам, які выдаў картку, падтрымліваецца тэхналогія дадатковага пацвярджэння аперацый, што здзяйсняюцца трымальнікамі картак з выкарыстаннем іх рэквізітаў у інтэрнэце (напрыклад Verified by Visa або MasterCard SecureCode), рэкамендуецца падключыць такую паслугу для забеспячэння больш высокага ўзроўню бяспекі інтэрнэт-плацяжоў.

А яшчэ эксперты прапануюць усталёўваць на свае прылады ліцэнзійнае праграмнае забеспячэнне, у тым ліку антывіруснае, міжсеткавыя экраны (фаерволы і брандмаўэры) і рэгулярна ажыццяўляць іх абнаўленне. Гэта дапаможа абараніць вашы прылады ад вірусаў і іншых дэструктыўных праграм, а таксама ад несанкцыянаванага доступу да канфідэнцыйнай інфармацыі. Нават калі вы ўпэўнены ў сваім праграмным забеспячэнні, не варта адкрываць або загружаць укладанні электронных лістоў ад незнаёмых і сумніўных адрасатаў.

І яшчэ. Спецыялісты лічаць, што не варта дазваляць браўзерам захоўваць інфармацыю аб вашай картцы «для спрашчэння здзяйснення пакупак у будучыні». Звычайна ў нас не такое супер-праграмнае забеспячэнне, якое немагчыма ўзламаць...

***У наступным матэрыяле рубрыкі «Разумныя грошы» мы раскажам пра асаблівасці правядзення аперацый з выкарыстаннем картак, а таксама аб нюансах сістэм дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання.***

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# КАНФІСКАВАНА АМАЛЬ 800 КГ МАКУ

**Такую колькасць насення ў рамках спецыяльнай праграмы «Мак» выявілі супрацоўнікі сталічнага наркакантролю.**

Мак быў знойдзены ў гаражы па вуліцы Будслаўскай. Гараж належаў 33-гадовай жанчыне і быў арандаваны ў яе жыхаром Мінска. Зараз уладальнік макавага насення ўстанаўліваецца. Сам тавар знаходзіцца на экспертызе, паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама. Праводзіцца праверка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


БелВЭБ

**Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»**

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, просп. Победителей, 29

**КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ ОАО «Банк БелВЭБ»**

*(в миллионах белорусских рублей)*

| | 31.03.2016 (неаудировано) | 31.12.2015 |
|---|---|---|
| **Активы** | | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 2 790 900 | 3 468 082 |
| Драгоценные металлы | 5 021 | 4 976 |
| Производные финансовые активы | 420 | 766 |
| Средства в кредитных организациях | 440 591 | 477 887 |
| Кредиты клиентам | 24 697 736 | 21 630 626 |
| Инвестиционные ценные бумаги, имеющиеся в наличии для продажи | 6 297 863 | 5 110 684 |
| Инвестиции в ассоциированную компанию | 37 972 | 39 182 |
| Основные средства | 1 497 510 | 1 464 915 |
| Активы, построенные для продажи | 174 376 | 184 852 |
| Инвестиционная недвижимость | 44 193 | 41 454 |
| Нематериальные активы | 311 017 | 304 535 |
| Текущий актив по налогу на прибыль | 38 683 | 39 783 |
| Отложенные активы по налогу на прибыль | 52 224 | 44 275 |
| Прочие активы | 493 748 | 514 107 |
| **Итого активы** | **36 882 254** | **33 326 124** |
| **Обязательства** | | |
| Средства кредитных организаций | 14 323 363 | 12 642 126 |
| Задолженность перед Национальным банком Республики Беларусь | 8 196 | 61 734 |
| Производные финансовые обязательства | 28 | 128 |
| Средства клиентов | 15 354 035 | 14 465 732 |
| Выпущенные долговые ценные бумаги | 29 205 | 27 520 |
| Текущие обязательства по налогу на прибыль | 16 746 | 2 252 |
| Отложенные обязательства по налогу на прибыль | 8 895 | 9 318 |
| Прочие обязательства | 985 870 | 253 813 |
| Субординированный кредит | 2 030 006 | 1 845 276 |
| **Итого обязательства** | **32 756 344** | **29 307 899** |
| **Капитал** | | |
| Уставный капитал | 4 730 571 | 4 730 571 |
| Эмиссионный доход | 4 579 | 4 579 |
| Дополнительный капитал | 54 853 | 54 853 |
| Фонд переоценки зданий | 240 011 | 240 964 |
| Накопленный дефицит | (990 063) | (1 100 606) |
| **Итого капитал, приходящийся на акционеров Банка** | **4 039 951** | **3 930 361** |
| Неконтрольные доли участия | 85 959 | 87 864 |
| **Итого капитал** | **4 125 910** | **4 018 225** |
| **Итого капитал и обязательства** | **36 882 254** | **33 326 124** |

**КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ОАО «Банк БелВЭБ» за период, закончившийся 31 марта 2016 года**

*(в миллионах белорусских рублей)*

| | За 3 месяца, закончившихся 31.03.2016 (неаудировано) | За 3 месяца, закончившихся 31.03.2015 (неаудировано) |
|---|---|---|
| **Процентные доходы** | | |
| Кредиты клиентам | 980 308 | 765 692 |
| Инвестиционные ценные бумаги | 124 843 | 60 978 |
| Средства в кредитных организациях | 5 118 | 4 412 |
| Финансовая аренда | 625 | 769 |
| | **1 110 894** | **831 851** |
| **Процентные расходы** | | |
| Средства кредитных организаций | (268 066) | (275 796) |
| Средства клиентов | (244 183) | (200 450) |
| Субординированный кредит | (30 657) | (19 012) |
| Выпущенные долговые ценные бумаги | (2 297) | (2 297) |
| | **(545 203)** | **(497 555)** |
| **Чистый процентный доход** | **565 691** | **334 296** |
| Резерв под обесценение кредитов | (193 223) | (292 516) |
| Эффект первоначального признания активов, по которым начисляются проценты | (490) | (964) |
| **Чистый процентный доход после резерва под обесценение кредитов** | **371 978** | **40 816** |
| **Чистые комиссионные доходы** | **129 049** | **94 358** |
| Чистые доходы по операциям с инвестиционными ценными бумагами, имеющимися в наличии для продажи | - | - |
| Чистые доходы/(расходы) по операциям в иностранной валюте: | | |
| - торговые операции | 77 808 | 115 810 |
| - операции с производными финансовыми инструментами | 987 | (1 104) |
| - переоценка валютных статей | (95 333) | (38 558) |
| Доля в убытке ассоциированной компании | (1 210) | (714) |
| Дивиденды | 1 | - |
| Прочие доходы | 57 777 | 58 431 |
| **Непроцентные доходы** | **169 079** | **228 223** |
| Расходы на персонал | (148 588) | (136 238) |
| Амортизация | (36 402) | (27 292) |
| Налоги, кроме налога на прибыль | (9 276) | (6 100) |
| Прочие операционные расходы | (146 204) | (110 911) |
| Прочие расходы от обесценения и создания резервов | (49) | (1 716) |
| **Непроцентные расходы** | **(340 519)** | **(282 257)** |
| **Прибыль до налога на прибыль** | **200 538** | **(13 218)** |
| Налог на прибыль | (9 329) | 7 789 |
| **Прибыль за отчетный период** | **191 209** | **(5 429)** |
| | | |
| Приходящаяся на: | | |
| - акционеров Банка | **190 836** | **8 141** |
| - неконтрольные доли участия | 373 | (13 570) |

**Председатель Правления** **Лузгин Н.В.**

**Главный бухгалтер** **Филиппова Л.А.**

**31 мая 2016 года**

Финансовая отчетность размещена на сайте www.belveb.by в разделе «О банке / Финансовые показатели деятельности банка / Квартальная финансовая отчетность / Квартальная финансовая отчетность по МСФО за 2016 год». ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27.12.2013 № 6. УНП 100010078.


■ Перспектыва

# ЯКАСНЫ ЛЕСАМАТЭРЫЯЛ ПЕРАПРАЦУЕМ САМІ

## А ледзь не палова прададзенай драўніны пастаўляецца ў Польшчу

**Сёлетні сезон для суб'ектаў лясной гаспадаркі выдаўся неблагі. Толькі за 4 месяцы года лясгасы павялічылі рэалізацыю круглых лесаматэрыялаў на ўнутраным рынку на 4%, паведаміў начальнік упраўлення вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі Міністэрства лясной гаспадаркі Аляксандр СУРТА.**

Усяго за гэты час арганізацыі Мінлясгаса рэалізавалі каля 2,8 млн кубічных метраў круглых лесаматэрыялаў, або 104% да аналагічнага перыяду летась. Менавіта сёлета павялічыўся ў краіне аб'ём рэалізацыі дзелавой драўніны і піламатэрыялаў. Рэшта непрададзенай нарыхтаванай драўніны на складах лясгасаў па стане на 1 мая склала 1,8 млн кубоў, што на 14% менш, чым у падобны перыяд мінулага года.

Калі ўнутраны попыт на драўніну выконваецца ў поўным аб'ёме, то з экспартам усё крыху складаней. Тут начальнік упраўлення нагадаў, што з 1 студзеня 2016 года экспарт круглых лесаматэрыялаў магчымы толькі па ўзгадненні з Прэзідэнтам Беларусі, і на 2016 год узгоднены экспарт балансаў і драўнянай тэхналагічнай сыравіны ў аб'ёме 1,9 млн кубічных метраў (з іх 1,7 мільёна павінны экспартаваць арганізацыі Мінлясгаса). Ужо цяпер на ўвесь гэты аб'ём заключаны кантракты. Больш за тое, па стане на 1 чэрвеня прыкладна 1,1 млн кубоў драўніны рэалізаваны. Зараз гэтае профільнае міністэрства сумесна з Мінэканомікі і канцэрнам «Беллеспаперапрам» рыхтуюць чарговы зварот кіраўніку дзяржавы і ўраду для ўзгаднення дадатковай партыі экспарту ў аб'ёме 1,1 млн кубічных метраў.

Пры гэтым Аляксандр Сурта падкрэсліў, што драўніна на экспарт ідзе па рэшткахвым прынцыпе. «Тыя аб'ёмы, якія мы просім дадаткова, не будуць пастаўляцца на шкоду ўнутранаму рынку. Наша першапачатковая задача — забяспечыць сыравінай беларускіх вытворцаў. На экспарт ідзе нізкагатунковая прадукцыя — баланс і тэхналагічная сыравіна. Яна, як правіла, не запатрабавана на ўнутраным рынку ў поўным аб'ёме», — адзначыў ён.

Экспертамі міністэрства было падлічана, што ў перыяд да 2020 года аб'ёмы нарыхтоўкі драўніны ўзрастуць да 24 млн кубічных метраў. А ў выніку лясгасы будуць мець свабодныя рэсурсы незапатрабаваных рэшткаў у аб'ёме каля 3 млн кубоў. Перспектыва такая, што нават пры поўнай загрузцы сваіх дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў будзе даволі значны аб'ём драўніны, які магчыма будзе экспартаваць.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Чалавек на сваім месцы

# ЗНАЙСЦІ ЭКСКАВАТАР, ВЯРНУЦЬ ГРОШЫ

**Ці часта вам даводзілася чытаць на старонках газет пра людзей такой прафесіі, як юрысконсульт? Прызнаюся, за шмат гадоў сваёй работы ніколі не пісала пра юрыста якога-небудзь прадпрыемства. Калегі, якіх удалося апытаць за час падрыхтоўкі гэтага матэрыялу, таксама не ўспомнілі пра свае публікацыі на ўказаную тэму. Я да таго, што нядаўна давялося пазнаёміцца з Канстанцінам САХАШЧЫКАМ, працоўнае жыццё якога звязана з захаваннем законнасці на вытворчасці.**



Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

Канстанцін Васільевіч пачаў працаваць на Пінскай вытворча-гандлёвай фірме «Зара» ў 80-х гадах пасля заканчэння юрыдычнага факультэта БДУ. У работу адразу ўвайшоў, як той казаў, з галавой. Нават тагачасны пракурор Пінска Аляксей Андрыевіч адзначаў, што фірма «Зара» больш за іншых прад'яўляе іскі ў суды, і ставіў апошняе ў заслугу вядучаму юрысконсульту.

Адной з першых яго спраў быў недапастаўлены экскаватар. Канстанцін Сахашчык успамінае, што «выбіць» машыну ўдалося праз расійскі арбітражны суд, што нярэдка тады даводзілася звяртацца ў судовыя і праваахоўныя органы Расіі. Яшчэ была гісторыя з лакам.

Фірма «Зара» паставіла партыю лаку валгаградскаму прадпрыемству «Расгасгандаль». Неўзабаве адтуль прыйшлі звесткі, што камісіяй выяўлена недастача 71 скрыні лаку. Але па хадайніцтве юрыдычнай службы беларускага прадпрыемства Варашылаўскі РАУС Валгаграда правёў праверку і ўстанавіў, што ў працэсе прыёмкі тавару прадстаўнік грамадскасці не прысутнічаў, хоць подпіс яго на акце быў. А пры фіктыўных подпісах, як вядома, ствараюцца ўсе ўмовы для крадзяжу. Суд адмовіў пакупніку ў яго іску. І такіх прыкладаў можна прыводзіць шмат. Нездарма ж Канстанцін Сахашчык у час работы на названым прадпрыемстве быў прызнаны першым сярод юрыстаў сваёй галіны па выніках абласнога конкурсу.

Багаты вопыт, атрыманы на Брэстчыне, Канстанцін Васільевіч выкарыстоўваў пазней у рабоце на мінскіх прадпрыемствах «Экалогія», «Мантажаўтаматыка». Апошняе займаецца праектаваннем, мантажом, наладкай і тэхнічным абслугоўваннем сістэм ахоўнай, пажарнай, трывожнай сігналізацыі. Кліентаў у прадпрыемства заўсёды было многа, сярод іх нямала траплялася такіх, хто не спяшаўся разлічвацца за праведзеную работу, зацягваў аплату на гады. Вельмі няпроста было дабівацца пагашэння запазычанасці на сотні мільёнаў рублёў.

На заслужаным адпачынку Канстанцін Сахашчык не сядзіць без справы, займаецца выкладчыцкай работай, піша артыкулы для навуковых і спецыяльных выданняў. Юрыст-практык перакананы ў неабходнасці новага закона аб юрыдычнай службе. У яго ёсць напрацоўкі на прадмет паляпшэння фінансавага стану суб'ектаў гаспадарання, для чаго юрыст прапануе распрацаваць новы парадак заключэння і выканання дагавораў. Сахашчык лічыць мэтазгодным увесці для людзей яго прафесіі асобную форму адзення, як, напрыклад, у судовых выканаўцаў. На яго думку, юрысконсультаў трэба вывесці з падпарадкавання кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый. Іх павінен накіроўваць спецыяльны орган Мінюста.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■

## ПЕРАКУЛІЛІСЯ ВАЙСКОВЫЯ МЕДЫКІ

**Аўтамабіль УАЗ вайсковых медыкаў перакуліўся ў сталіцы.**

Здарэнне адбылося ранкам на праспекце Пераможцаў непадалёку ад «Мінск-Арэны». Паводле інфармацыі ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, аўтамабіль УАЗ, які належаў вайсковай хуткай дапамозе, не паспеў затармазіць перад машынамі, што спыніліся на чырвоны сігнал святлафора. Каб пазбегнуць сутыкнення, кіроўца накіраваў транспартны сродак убок. У выніку машына перакулілася. Двух вайскоўцаў з яе даставілі ў бальніцу для абследавання. Іншых пацярпелых у гэтым дарожна-транспартным здарэнні не было.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


ВТБ

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Республика Беларусь, 220007, г. Минск, ул. Московская, 14
Тел.: (+375 17) 309 15 15, (+375 29) 309 15 15, (+375 33) 309 15 15

**Консолидированный бухгалтерский баланс на 1 апреля 2016 г. ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2016 год | 2015 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 301 586 | 334 267 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 754 473 | 2 880 270 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 457 485 | 444 714 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 3 309 251 | 59 924 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 9 070 081 | 7 169 733 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 347 | 355 570 |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | - | - |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | - | - |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 250 | 22 |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 558 667 | 481 758 |
| 13 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 25 098 | 28 173 |
| 14 | Отложенные налоговые активы | 1111 | 4 305 | 3 357 |
| 15 | Деловая репутация | | - | - |
| 16 | Прочие активы | 1112 | 262 033 | 138 294 |
| 17 | ИТОГО активы | 11 | 14 743 576 | 11 896 082 |
| 18 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 19 | Средства Национального банка | 1201 | 509 941 | 506 290 |
| 20 | Средства банков | 1202 | 3 883 110 | 3 217 862 |
| 21 | Средства клиентов | 1203 | 8 191 500 | 6 305 139 |
| 22 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 325 325 | 53 238 |
| 23 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 1 982 | 4 598 |
| 24 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 25 | Прочие обязательства | 1207 | 298 753 | 369 786 |
| 26 | ВСЕГО обязательства | 120 | 13 210 611 | 10 456 913 |
| 27 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 28 | Уставный фонд | 1211 | 779 620 | 779 620 |
| 29 | Эмиссионный доход | 1212 | 34 320 | 34 320 |
| 30 | Резервный фонд | 1213 | 88 868 | 82 563 |
| 31 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 286 539 | 235 717 |
| 32 | Накопленная прибыль | 1215 | 343 618 | 306 949 |
| 33 | Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации-банку | | 1 532 965 | 1 439 169 |
| 34 | Доля неконтролирующих акционеров | | - | - |
| 35 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 1 532 965 | 1 439 169 |
| 36 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 14 743 576 | 11 896 082 |

**КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2016 г.**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2016 год | 2015 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 539 126 | 375 736 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 269 631 | 245 719 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 269 495 | 130 017 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 136 776 | 130 327 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 19 393 | 20 032 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 117 383 | 110 295 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 149 | 177 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 66 985 | (205 086) |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (34 388) | 298 655 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 224 019 | 106 965 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 25 365 | 22 495 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 147 070 | 133 108 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 6 452 | 8 118 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 67 448 | 108 362 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | 9 203 | 44 039 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 58 245 | 64 323 |
| | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | - | - |
| | Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц | | - | - |
| | ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | | 58 245 | 64 323 |
| | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации-банку | | 58 245 | 64 323 |
| | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | - | - |

**Председатель Правления** **В.В. Иванов**

**Главный бухгалтер** **М.В. Дудко**

**Дата подписания «19» мая 2016 г.**

**Финансовая отчетность в соответствии с НСФО на 1 апреля 2016 в полном объеме размещена на сайте банка по адресу: www.vtb-bank.by.**

УНП 101165625



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, НАХОДЯЩЕГОСЯ В СОБСТВЕННОСТИ ОАО «СКИДЕЛЬСКИЙ САХАРНЫЙ КОМБИНАТ»**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Предмет торгов, краткая характеристика | **Лот №1** **Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 401/U-26651** (здание неустановленного назначения), общей площадью 1592,9 кв.м, составные части и принадлежности – подвал, степень готовности – 69% | | |
| Местонахождение имущества | Гродненская обл., Гродненский р-н, г. Скидель, ул. Первомайская, 27 | | |
| Информация о земельном участке | Имущество расположено на земельном участке площадью 0,5434 га с кадастровым номером 422050400001000128, назначение – для обслуживания незавершенного законсервированного капитального строения. Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах линий электропередачи, площадь 0,0802 га. | | |
| Начальная цена | **897 631 290 рублей с учетом НДС** | Сумма задатка (5%) | 44 882 000 рублей |
| Сведения о продавце | ОАО «Скидельский сахарный комбинат», г. Скидель, ул. Первомайская, 1, тел.8(0152) 977831 | | |
| Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка | Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8(0152) 74 49 11, р/с 3015575033025 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код 739, УНП 500481906 | | |
| Срок заключения договора купли-продажи | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о проведении торгов | Условия оплаты определяются по согласованию сторон | |
| **Торги состоятся 8 июля 2016 года в 14.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | |
| Срок подачи документов для участия в торгах | **По 4 июля 2016 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8** | | |
| **Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте организатора торгов www.fincentr.by** | | | |
| Дополнительная информация по телефонам в г. Гродно: 8(0152) 77 23 79, 74 49 11 | | | |



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ В Г. ПРУЖАНЫ БРЕСТСКОЙ ОБЛАСТИ**

Аукцион состоится 27 июня 2016 года в 14.30 по адресу: г. Пружаны, ул. Г. Ширмы, 17, каб. 321 (малый зал)

| Номер лота, местонахождение участка | Площадь, га | Кадастровый номер | Срок аренды, лет | Начальная цена, руб. | Расходы по формированию земельного участка (в том числе по государственной регистрации), руб. | Сумма задатка | Целевое назначение (назначение в соответствии с единой классификацией) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| ЛОТ 1 г. Пружаны, ул. Западная, 6 | 0,1198 | 125650100001004734 | - | 100 000 000 | 9 441 727 | 10 000 000 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (код 10902, земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома)) |
| ЛОТ 2 г. Пружаны, ул. Шоссейная, 13 | 0,1198 | 125650100001004735 | - | 100 000 000 | 7 258 369 | 10 000 000 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (код 10902, земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома)) |

Принимать участие в аукционе по продаже земельных участков в частную собственность имеют право **граждане Республики Беларусь.**

Условия проведения аукциона – **наличие не менее двух участников**.

Заявление на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Пружаны ул. Г. Ширмы, 17, каб. 114 (землеустроительная служба) с 8.00 до 17.00 по рабочим дням до 22 июня включительно.**

Для участия в аукционе необходимо представить:

1) **заявление** на участие в аукционе по установленной форме,

2) документ, подтверждающий **внесение суммы задатка** на р/с 3600225000000 в центре банковских услуг №122 филиала № 113 ОАО «Сберегательный банк «Беларусбанк», код 237, назначение платежа: 04901 — на право частной собственности, получатель платежа – райфинотдел, УНП 200141043**, с отметкой банка.**

Кроме того, в комиссию предоставляются:

**гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

**представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Граждане Республики Беларусь, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов аукциона.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон.

Порядок осмотра на местности земельного участка: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим.

Условия инженерного развития инфраструктуры: в непосредственной близости имеются инженерные коммуникации.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона или признания аукциона несостоявшимся внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона по продаже в частную собственность, либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

Кроме оплаты за участок, победитель аукциона возмещает расходы, связанные с подготовкой аукциона, и расходы по публикации извещения в средствах массовой информации в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

**Контактный телефон в г. Пружаны 8 (01632) 91369**

# РОДНАЕ СЛОВА: ДАРОГА Ў ШЫРОКІ СВЕТ

**У Дзелавым і культурным комплексе Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі прайшоў «круглы стол» «Беларуская літаратура ў Расіі: сёння і заўтра»**

**Як беларускае слова падарожнічае па свеце? Каго перакладаюць у блізкіх і далёкіх ад Беларусі краінах? Каго з беларускіх пісьменнікаў проста ведаюць на планеце? Несумненна, для айчыннай літаратуры гэтыя пытанні з'яўляюцца надзвычай хвалюючымі, важнымі. І, канешне ж, ва ўсе дзесяцігоддзі, а мо нават і ва ўсе стагоддзі пытанні такога кшталту разглядаліся найперш у фармаце беларуска-расійскіх зносін. Уражлівым у гэтым плане з'яўляецца дваццатае стагоддзе, калі і Расія многім мільёнам чытачоў адкрывала беларускую літаратуру, беларускі мастацкі свет, а яшчэ — праз рускую мову, праз магчымасці маскоўскіх выдавецтваў і найперш маскоўскіх масмедыя ўводзіла лепшыя творы беларускіх пісьменнікаў у іншыя краіны. Тым больш, што быў і вопыт выдання раманаў, аповесцяў, апавяданняў, паэтычных твораў нацыянальных літаратур у Маскве і на англійскай, ды іншых мовах свету. Адзін толькі вопыт часопіса «Савецкая літаратура» чаговарты! Дзякуючы гэтаму выданню творы і многіх у тым ліку беларускіх пісьменнікаў былі перакладзены на англійскую, іспанскую, нямецкую, французскую мовы. А з 1949 года часопіс выходзіў і па-польску. Можна прыгадаць яшчэ і маскоўскае выдавецтва «Прогресс»...**



А як жа сітуацыя складваецца сёння? Што захавалася ў зносінах беларускай і рускай літаратур? Ці ёсць цікавасць выдаўцоў Масквы, Санкт-Пецярбурга, іншых куточкаў Расіі да беларускай літаратуры? Ці заўважаюць беларускае мастацкае слова літаратурна-мастацкія перыядычныя выданні Расіі?.. Пра гэта і гаварылі ўдзельнікі «круглага стала».

## ФАРМАТ РАЗМОВЫ

Тэмаў у абсягах, якія кранае сама назва «круглага стала», — безліч. І гэта адчуваецца яшчэ і таму, што не так часта ўсё ж збіраюцца зацікаўленыя асобы для размоў і дыскусій. Таму ідэю Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, якое і стала галоўным ініцыятарам правядзення «круглага стала», можна толькі вітаць. Да партнёрства ў арганізацыі творчага праекта далучыліся Саюз пісьменнікаў Беларусі і Выдавецкі дом «Звязда». Падаецца прадстаўнічым і ўдзел расійскага боку. З вітальнымі словамі ў самым пачатку работы «круглага стала» выступілі Спецыяльны прадстаўнік Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі па міжнародным культурным супрацоўніцтве Міхаіл Швыдкой, выканаўчы дырэктар Міжнароднага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва СНД Анатоль Іксанаў, генеральны дырэктар «Российской газеты» Павел Нягоіца.

І тут нельга не згадаць сказанае Паўлам Нягоіцам. «Российская газета» і беларуска-расійскі дадатак да яе «Союз. Беларусь — Россия» (у «круглым стале» ўдзельнічала і яго рэдактар Вольга Герасіменка) дастаткова ўважлівыя да гуманітарнай тэматыкі. Адпаведна — да сучаснага літаратурнага працэсу ў Беларусі і Расіі. Генеральны дырэктар перакананы, што веданне пра культуру, яе традыцыі, здабыткі, сучасны стан якраз і збліжае народы. Пра гэта былі словы і ў вітанні ўдзельнікам «круглага стала» ад імя старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалая Чаргінца.

А што да МФГС, то менавіта дзякуючы яго шматграннай рабоце ў Беларусі і Расіі наладжаны добры мост зносін. Серыя кніг Выдавецкага дома «Звязда» «Созвучие сердец» якраз і дапамагла асобнай бібліятэкай паказаць сучасную літаратуру Беларусі. Ведаю, што многія перакладчыкі ў рэгіёнах Расіі якраз для знаёмства з беларускай паэзіяй і прозай апошніх гадоў і карыстаюцца гэтай кніжнай серыяй з 11 зборнікаў, а таксама — альманахам «Созвучие» (пабачылі свет тры выпускі). Значыць, высноў з гэтай часткі размовы вынікае важная задача: трэба ўмець расказваць пра тое, што робіцца, данесці да чытача і калег-пісьменнікаў, перакладчыкаў самі творы ці інфармацыю пра іх.

Не аднойчы гаварылася якраз пра гэта і міністр інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч. Святлом, якое павінна паўплываць на развіццё актыўнасці ў беларуска-расійскіх літаратурных, кніжных стасунках, павінна стаць падрыхтоўка да 500-гадовага юбілею беларускага кнігадрукавання (жнівень 2017 года). Уражальным вопытам у гэтым плане Лілія Станіславаўна назвала анталогію «Францыск Скарына на мовах народаў свету», дзе вядомыя беларусам словы з адной скарынаўскай прадмовы гучаць на 64 мовах. І ў дзясятках паэтычных выкладанняў — на мовах народаў Расіі. Другое выданне гэтай анталогіі ўжо пабачыць свет з падтрымкай расійскага боку.

## ЗРОБЛЕНАЕ СЁННЯ ЯК ТРЫВАЛЫ ГРУНТ...

У апошнія дзесяць-пятнаццаць гадоў два расійскія творчыя праекты добрасумленна дапамагалі чытачам Расіі не згубіць уяўленні пра беларускую літаратуру. Найперш — «Литературная газета» з тэматычным дадаткам «Лад». І — штогадовы «беларускі нумар» часопіса «Наш современник». Гэтыя выпускі здзяйсняліся пры фінансавай падтрымцы Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. За гады дзясяткі беларускіх пісьменнікаў былі прадстаўлены сваімі новымі творамі праз пераклады на рускую мову, зробленыя, між іншым, як у Беларусі, так і ў Расіі. Для паэтаў, празаікаў, якія жывуць і працуюць у Мінску, іншых рэгіёнах Беларусі, такія публікацыі станавіліся выхадам у шырокі свет. Нядаўна давялося пагутарыць з народным паэтам Татарстана Рэнатам Харысам: якраз пісьменніцкую газету і «Наш современник» ён назваў крыніцамі, вокнамі, што насычалі яго святлом беларускага мастацкага слова ў апошні час. Ці прадоўжыцца такая практыка заўтра? Пра гэта з трывогай гаварыў рэдактар аддзела прозы часопіса «Наш современник», вядомы рускі пісьменнік Яўген Шышкін.

Напрацаваны вопыт беларуска-расійскіх зносін і ў дырэктара выдавецтва «Художественная литература» Георгія Прахіна. Ён — часты госць у Беларусі, добра ведае сучасную беларускую літаратуру. Георгій Уладзіміравіч вылучыў шэраг ідэй, якія маглі б рэалізавацца ў яго выдавецтве. Пра вартасць супольнай рэалізацыі праектаў па знаёмстве ў Расіі з беларускай літаратурай гаварыў на «круглым стале» і галоўны рэдактар часопіса «Роман-газета» Юрый Казлоў. У партфелі яго выдання — адмысловы беларускі нумар, які складаецца з аповесцяў, што былі надрукаваны ў беларускіх часопісах у апошнія гады. Але і расійскім выдаўцам, і беларускім аўтарам, а яшчэ і чытачам аднолькава важна, каб гэты выпуск патрапіў і ў Беларусь.

Удзельнічаў у рабоце «круглага стала» і вядомы рускі паэт, перакладчык Сяргей Главюк. Менавіта дзякуючы яго руплівасці з'явілася адмысловая анталогія беларускай паэзіі на рускай мове. Праўда, пра яе мала ведаюць у самой Беларусі. З падтрымкай гэтага расійскага праекта маглі б, несумненна, выступіць нашы айчынныя бібліятэкі. Як гэта толькі зрабіць?.. Але ж пытанне патрабуе вырашэння. Мо тады і самі выдаўцы будуць працаваць больш ініцыятыўна — з жаданнем прадставіць новы плён сучаснай беларускай паэзіі. Сяргея Главюка добра ведаюць у славянскім свеце. І яго ўвага да беларускай нацыянальнай паэзіі — гэта яшчэ і пашырэнне сусветнай вядомасці беларускай літаратуры.

## ЗАЎТРАШНІЯ СПАДЗЯВАННІ

Так склалася, што сярод удзельнікаў «круглага стала» ў Дзелавым і культурным комплексе Пасольства Беларусі ў Расійскай Федэрацыі было шмат даўніх руплівцаў на ніве беларуска-расійскага літаратурнага яднання. Гэта — і рускі і беларускі празаік, паэт, публіцыст, паліталаг, намеснік старшыні ФНКА «Беларусы Расіі» Валерый Казакоў, і публіцыст, старшыня ФНКА «Беларусы Расіі», доктар псіхалагічных навук Сяргей Кандыбовіч, і паэт, празаік, перакладчык, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь Бадак, і перакладчык, намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда» — галоўны рэдактар часопіса «Нёман» Аляксей Чарота, рускі паэт Анатоль Усаў (між іншым, родам з Беларусі — з Гомельшчыны)... І ў час размовы, пра якую ідзе гаворка, і раней — на падобных сустрэчах і дыскусіях не толькі ў Маскве, але і ў Мінску — яны заўсёды вылучалі і вылучаюць розныя практычныя ідэі. Вопыт гэтых ініцыятараў беларуска-расійскага літаратурнага супрацоўніцтва значыць вельмі і вельмі шмат. Таму да іх падказак варта і прыслухацца. Даўно, напрыклад, наспела патрэба арганізацыі шырокага беларуска-расійскага творчага семінара літаратурнай моладзі. І з абавязковай секцыяй мастацкага перакладу ў ім. Літаратура — гэта заўсёды асобы. І калі, напрыклад, пасябруюць тыя ці іншыя творцы, пагутараць адзін з адным часам — і сам-насам, то, відаць, карысці з гэтага будзе не меней, а шматкроць болей, чым з іншай нарады.

Літаратурную моладзь нашых краін яднае і конкурс «Мост дружбы», які ладзіць Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы. Хацелася б, каб у конкурсу было доўгае жыццё. Тым больш, што па яго выніках выходзіў альманах на дзвюх мовах. Міністр інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч заўважыла, што сёлета ў Беларусі распачаты конкурс на лепшы твор сярод моладзі Расіі і Беларусі і іншых краін СНД. Заснавалі яго міністэрства і Выдавецкі дом «Звязда».

...«Круглы стол» «Беларуская літаратура ў Расіі: сёння і заўтра», несумненна, мог бы стаць асновай да грунтоўнай навукова-практычнай канферэнцыі на тэму «Беларуска-расійскія літаратурныя адносіны на сучасным этапе». Але ў арганізацыі такой дыскусійнай і вельмі вартай, своечасовай тэматычнай пляцоўкі, канешне ж, не абысціся без удзелу навукоўцаў. У першую чаргу — Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Інстытута сусветнай літаратуры імя М. Горкага Расійскай акадэміі навук. Каб не згубіць напрацаванае раней, каб разам ісці наперад, трэба вылучаць і рэалізоўваць новыя ініцыятывы, умацоўваць грунт творчых зносін і сёння.

**Павел АЛЬСОВЫ,**
*Масква — Мінск.*

■ Падзея

# КАСМІЧНАЯ ПАМЯЦЬ

**Пад Мінскам урачыста адкрылі павільён «Космас» і Алею Герояў**



**Урачыстае адкрыццё павільёна «Космас» адбылося ў Мінскім аэраклубе ДТСААФ. Цяпер, завітаўшы ў пасёлак Баравая, які побач са сталіцай, можна ўбачыць унікальныя экспанаты на касмічную тэматыку. А на тэрыторыі 50-й змяшанай авіябазы, што ў Мачулішчах, ушанаваць памяць герояў-авіятараў.**

Першымі касмічныя экспанаты музея-павільёна ацанілі касманаўты — ураджэнцы Беларусі, лётчыкі-касманаўты СССР і Расійскай Федэрацыі, славутыя лётчыкі-выпрабавальнікі. Наведвальнікі экспазіцыі, сярод якіх і высокапастаўленыя дзяржаўныя асобы, убачылі спускальны апарат карабля «Саюз», лажамент і скафандр касманаўта Пятра Клімука, манекен у касмічным скафандры, касцюмы экіпажа міжнароднай касмічнай станцыі і набор бартавога харчавання для касманаўтаў. З дапамогай дакументаў і фотаздымкаў усе ахвотныя азнаёміцца з асноўнымі этапамі засваення космасу.

— Сёння адкрываецца першы ў Беларусі музейны павільён, прысвечаны космасу, — адзначыў падчас урачыстага мерапрыемства **дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Станіслаў ЗАСЬ**. — Гэта наша даніна павагі тым, хто стаяў ля вытокаў развіцця галіны. Беларусь з самага пачатку была ўключана ў касмічныя распрацоўкі. Многія нашы землякі сталі ля вытокаў касманаўтыкі.

Гэтыя людзі, якімі ганарыцца Беларусь, — Пётр Клімук, Уладзімір Кавалёнак і Алег Навіцкі — сталі галоўнымі героямі мерапрыемства. Кожны з іх перадаў музею-павільёну свае рэчы.

У экспазіцыі — скафандр Пятра Клімука, у якім касманаўт здзейсніў свой другі касмічны палёт. На адкрыцці павільёна генерал-палкоўнік у адстаўцы прызнаўся, што ганарыцца Беларуссю і яе людзьмі, а таксама радуецца поспехам краіны. «Яшчэ раз пераканаўся, што самае вялікае багацце — гэта людзі, якія робяць усё, каб і зямля была багацейшая, і самі яны былі больш заможныя», — перакананы **двойчы Герой Савецкага Саюза Пётр КЛІМУК**.

**Касманаўт Уладзімір КАВАЛЁНАК** расказаў, што на Усебеларускім народным сходзе адзін з аратараў сённяшняга мерапрыемства выступіць з прапановай, каб Беларусь прыняла ўдзел у падрыхтоўцы сваіх касманаўтаў. Па словах двойчы Героя Савецкага Саюза, не выключана, што беларусы змогуць паступаць у Цэнтр падрыхтоўкі касманаўтаў у Расіі. «Касманаўтам стаць проста, варта толькі захацець, — упэўнены Уладзімір Кавалёнак. — Так што, юнакі і дзяўчаты з Беларусі, наперад у аэраклубы — на самалёты! А потым — у космас!»

— Космас — гэта вельмі патрэбная сфера дзейнасці чалавека, — лічыць **касманаўт-выпрабавальнік, Герой Расіі Алег НАВІЦКІ**. — Перспектывы ў нас велізарныя. Напрыклад, мы разглядаем палёты да далёкіх планет.

Своеасаблівым працягам мерапрыемства стала адкрыццё Алеі Герояў 50-й змяшанай авіяцыйнай базы Узброеных Сіл, што дыслакуецца ў Мачулішчах.

— Мы помнім, што воіны 50-га асобнага змяшанага авіяцыйнага палка праявілі найвышэйшую мужнасць і геразім у ходзе ваенных дзеянняў у Афганістане, калі ўпершыню ў найноўшай гісторыі менавіта воіны-інтэрнацыяналісты кінулі выклік міжнароднаму тэрарызму і спробам увесці свет у пострывілізацыйны хаос, — сказаў падчас адкрыцця Алеі Герояў **начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны генерал-маёр Алег БЕЛАКОНЕЎ**. — Пра баявое напружанне лётнага складу, які ваяваў у Афганістане, сведчаць наступныя факты. За суткі кожны лётчык у сярэднім здзяйсняў да 6—8 баявых вылетаў, а за год знаходжання ў Афганістане лётны склад выканаў да 800 вылетаў з агульным налётам больш як тысячу гадзін.

Пасля таго, як Алея Герояў урачыста адкрылася пад гукі ваеннага аркестра, ганаровыя госці і ўсе прысутныя ўбачылі ваенную тэхніку, якая стаіць на ўзбраенні вайсковай часці, наведалі самалёт-музей воінскай славы.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■ Запрашальнік

# САПРАЎДНЫ БАЛЬ І ГРОЗНАЯ БАТАЛІЯ

## Рэканструюючы падзеі 1812 года

**18—19 чэрвеня на базе аграсядзібы «Залатая шпора» ў вёсцы Міжрэчча Валожынскага раёна адбудзецца адзіны ў краіне штогадовы гістарычны фэст-рэканструкцыя падзей 1812 года. Госці імпрэзы змогуць паглыбіцца ў «эпоху апошняй прыгожай вайны». Тут можна будзе ўбачыць атакі бравай кавалерыі і наступ грознай пяхоты, закруціцца ў віхуры вальса на Вялікім балі ці апынуцца на кірмашы сярод сялян Беларусі XIX стагоддзя, пачуць іх песні, навучыцца народным танцам і рамёствам.**



Уся тэрыторыя будзе падзелена на некалькі зон. На адной з іх разгорнецца падворак народнай культуры. «Святочны кірмаш на Тройцу» прадставіць «Студэнцкае этнаграфічнае таварыства». Маладыя даследчыкі фальклору і пераймальнікі народных традыцый пакажуць, як жылі нашы продкі, і навучаць традыцыйным беларускім танцам. Прагучаць лірычныя і абрадавыя песні Беларусі XIX стагоддзя. Народныя майстры навучаць гасцей фестывалю ткаць, вышываць, прасці ці каваць.

Тыя, каго цікавіць шляхецкая культура, змогуць узяць урокі фехтавання на шпагах, убачыць паказальныя выступы майстроў старажытнай шабельнай школы Рэчы Паспалітай. Адной з «фішак» фэсту стануць урокі ампірных танцаў. Гледачы змогуць развучыць асноўныя рухі мазуркі, вальса і паланэза, каб затым прыняць удзел у самым сапраўдным шляхетным балі!

Трэцяй тэматычнай зонай фестывалю стане рэканструкцыя вайсковага лагера беларускай кавалерыі, дзе раскватаруюцца салдаты і афіцэры 17-га ўланскага палка Вялікага Княства Літоўскага.

У фестывалі возьмуць удзел каля 40 кавалерыстаў, якія будуць прадстаўляць як французскую Вялікую армію, так і Рускую імператарскую гвардыю. Яны пакажуць свае вартасць у кавалерыйскіх спаборніцтвах на піках і шаблях. А затым адбудуцца спаборніцтвы па джыгітоўцы. Конныя трукі на поўным скаку — саскок, вісы, абрывы і многае іншае. Такое можна ўбачыць толькі ў кіно... і на гэтым фэсце. Многія ўдзельнікі спаборніцтваў па джыгітоўцы — конныя каскадзёры, якія здымаюцца ў фільмах.

Апагеем свята стане грандыёзная баталія. Гасцей таксама чакае мноства пунктаў анімацыі і карчма з аўтарскай беларускай кухняй.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**
*nina@zviazda.by*

■ Рыштаванні Бацькаўшчыны

# ПОШТА Ў СТЫЛІ КАНСТРУКТЫВІЗМУ

## Як узвядзенне аднаго будынка асвятлялася ў прэсе 1930-х гадоў

**У Лідзе захавалася каля дзясятка дамоў, пабудаваных у стылі функцыяналізму (інакш канструктывізму). Але сапраўднай перлінай гэтага стылю з'яўляецца памяшканне лідскай пошты. Пры канцы 1930-х гадоў паштовыя гмахі ў стылі функцыяналізму таксама былі пабудаваныя ў Гдыні, Быдгашчы, у заходнеўкраінскім Луцку. Будынкі ў Быдгашчы і Луцку — «родныя браты» лідскай пошты. Цікава, што згодна з гарадскімі легендамі, паштамты ў Быдгашчы і Лідзе як быццам будаваліся па праекце англійскіх архітэктараў, якія падарылі Лідзе, можа, самы стылёвы будынак, дагэтуль не ўдалося. Я неадназначна чуў меркаванні спецыялістаў, што гэты прыгожы гмах з адмысловымі кратамі на вокнах лёгка ўявіць сабе на самай фешэнебельнай вуліцы еўрапейскага горада. Нават больш позняя мазаіка, зробленая ўнутры перакрытай светлавымі вокнамі аперацыйнай залы, арганічна ўпісалася ў інтэр'ер будынка.**

Першае паведамленне пра пачатак будаўніцтва новай лідскай пошты змяшчаецца ў жнівеньскім нумары 1936 года газеты «Кур'ер Віленьскі», у якім Дырэкцыя поштаў і тэлеграфаў Віленскай акругі абвясціла публічныя таргі на будаўніцтва лідскай пошты. У маі 1937 года паведамлялася, што *«ў найбліжэйшыя месяцы ў новым раёне горада каля гімназіі паўстане другі гмах коштам больш за мільён злотых (першы мільённік — будынак гімназіі). Тут будзе ліставая пошта, тэлеграф і тэлефон. У памяшканнях вышэй ад першага паверха размесціцца персанал ліставой пошты, аддзелаў тэлеграфа і тэлефона, кіраўнікоў гэтых аддзелаў»*. Ужо ў кастрычніку 1937 года корпус гмаха пошты быў зроблены «пад дах» і накрыты. Узімку планавалі пачаць унутраныя работы, таму частковае адкрыццё новай пошты магло адбыцца яшчэ ўвесну 1938 года, але работы затрымліваліся.

Бліжэй да заканчэння будаўніцтва, у траўні 1938 года лідскія паштавікі пачалі атрымліваць новую тэхніку: *«Матарызацыя пошты. Управа пошты і тэлеграфа ў Лідзе атрымала 5 аўтамабіляў маркі «Польскі фіят». Цяпер конны воз для дастаўкі пошты будзе служыць толькі там, дзе аўтамабіль не зможа праехаць»*.

Хутка стала зразумела, што да 1 верасня здаць у эксплуатацыю новы будынак не паспеюць, прэса пісала: *«Пошта ў гатэлі? Будаўніцтва паштовага гмаху ў Лідзе марудна пасоўваецца наперад.*





**Адметна, што замест першапачатковай сумы ў мільён злотых, новы будынак з абсталяваннем абышоўся ў 524 тысячы. Цікава, на чым сэканомілі?**

*Паштовыя ўлады ўсімі сіламі рупяцца паскорыць тэрмін адкрыцця новай пошты, з-за хуткага развіцця горада даўно пара было б вырашыць гэтую праблему. Калі ўсё ж будоўля затрымаецца, лідскія паштовыя ўлады будуць змушаны браць за ўзор вырашэнне праблемы з зацягваннем будаўніцтва пошты № 2 у Вільні — там новая пошта часова пераехала ў гатэль. Здаецца, такі самы лёс чакае і пошту ў Лідзе»*.

Гарадскія ўлады да моманту адкрыцця новай пошты рыхтавалі вуліцу Міцкевіча, на якой яна знаходзілася (гэтак вуліца называецца і цяпер): *«...вуліца Адама Міцкевіча дачакалася ўладкавання і цвёрдага дарожнага пакрыцця. Забрукоўка ідзе ў паскораным тэмпе з-за хуткага заканчэння будоўлі. З моманту перанясення пошты ў новы гмах вуліца ажыве»*.

Віленская прэса паведамляла: *«Вуліца Адама Міцкевіча ў Лідзе сваім выглядам можа канкураваць з лепшымі вуліцамі Вільні. Але толькі ўдзень, бо ўвечары пануе на ёй егіпецкая цемра. Няма аніводнай лямпы. Чаму кіраўніцтва гарадской электрастанцыі не звярнае на гэта ўвагі?»*. З тэксту вынікае, што першай заасфальтаванай вуліцай Ліды была акурат вуліца Міцкевіча.

Ганаровае адкрыццё новага будынка адбылося толькі на пачатку мая 1939 года. Верагодна, да гэтага часу быў цалкам закончаны мантаж абсталявання. «Кур'ер Віленьскі» пісаў: *«У межах святкавання свята 3-га мая адбылося ўрачыстае асвячэнне пабудаванага коштам 524 000 зл. гмаха Паштовай управы»*. Адметна, што замест першапачатковай сумы ў мільён злотых новы будынак з абсталяваннем абышоўся ў 524 тысячы. Цікава, на чым сэканомілі?

Будынак лідскай пошты — сапраўдны шэдэўр канструктывізму першай паловы XX стагоддзя. Сёння ахоўваецца як помнік гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

**Леанід ЛАЎРЭШ**

# НАТХНЕННЕ «СПУСЦІЛАСЯ» З НЕБА...

**125 гадоў таму, седзячы на адным з узгоркаў Валожына, Хаім Бялік напісаў верш «Да птушкі», які ў пэўным сэнсе стаў культавым. Менавіта ім распачалася свецкая паэзія на іўрыце. На Валожыншчыне вырашылі прыгадаць гэту падзею. З нагоды зладзілі выставу выцінанкі народнай мастачкі Валянціны Слюнчанкі, зрабілі пераклад таго памятнага верша на сучасную беларускую мову.**

Згодна з паданнем, у адзін з цёплых вясновых дзён красавіка 1891 года, седзячы на сваім любімым узгорку (дзе цяпер знаходзіцца сельскагаспадарчы ліцэй), пасля доўгай, знясільваючай зімы, 18-гадовы Бялік быў так зачараваны шчабятаннем птушак, якія вярнуліся з поўдня, што словы верша раптам праліліся аднекуль зверху — з Боскай вышыні. Ён занатаваў: «О, цудоўная птушка, ты вярнулася на сваю радзіму праз далёкую і даўно страчаную маю. Скажы мне, як яна там жыве гэты доўгі час, без мяне і ўсіх нас?»

Верш пабачыў свет толькі ў наступным 1892 годзе ў Адэсе, калі Бялік, які на той момант ужо зусім страціў надзею, вярнуўся ў бацькаў Жытомір, дзе яго ведаў хоць нехта, дзе меліся хоць бы невялікія «зачэпкі» за рэальнае жыццё. Да сучаснага стану прызнанага пісьменніка яму было яшчэ бясконца далёка, але слава ўжо прыйшла. Аказалася, на іўрыце можа існаваць сучасная свецкая паэзія!



**У Валожыне шмат гарыстых краявідаў, здольных натхняць на стварэнне паэтычных шэдэўраў.**

Энтузіястаў, якія вырашылі, чаго б гэта ні каштавала, вярнуць жыццё «мёртваму», на думку большасці, іўрыту — рабілася ўсё болей. А постаць Бяліка заставалася заўважнай сярод іх. Калі ў свае 50 гадоў, пасля шматгадовых блуканняў па Расійскай імперыі і Германіі, наважыўся ўрэшце пераехаць у Палесціну, ён ужо — прызнаны агульнанацыянальны паэт нумар адзін, геній і прарок. І гэта нягледзячы на тое, што яго варыянт іўрыта ўжо лічыўся састарэлым, «занадта славянскім». На гістарычнай радзіме быў прыняты зусім іншы стандарт мовы, блізкаўсходні, значна набліжаны па гучанні да роднаснай арабскай. Да гэтай дзіўнай мовы пісьменнік ужо не паспеў прызвычаіцца. І жыць яму заставалася не так шмат. У 1934 годзе ён памёр у Вене пасля няўдалай аперацыі. На здабытай радзіме яго пахавалі як сапраўднага нацыянальнага героя. А Валожын назаўжды застаўся сімвалічнай радзімай адроджанай паэзіі на іўрыце...

Аснову выставы, што разгарнулася ў Валожынскім раённым краязнаўчым музеі, склалі выцінанкі Валянціны Слюнчанкі, распрацаваныя спецыяльна да памятнай даты, а таксама тыя, што ілюструюць яўрэйскія святы. Творы, якія прадстаўляюць верш «Да птушкі», Валожынскі ешыбот «Дрэва жыцця», у якім вучыўся будучы знакаміты творца, Налібоцкую пушчу мастачка стварала па канцэптуальных ідэях Алеся Белага, каардынатара Зялёнага маршруту «Валожынскія гасцінцы». Варта адзначыць, што праект «Рэгіянальныя сувеніры як сродак умацавання патэнцыялу агратурыстычных супольнасцяў», у межах якога выраблялiся выцінанкі, ладзіцца пры садзейнічанні Праграмы падтрымкі Беларусі Федэральным урадам Германіі.

Таксама ў межах праекта вядомы карыкатурыст Аляксандр Каршакевіч стварыў некалькі работ, якія адлюстроўваюць тэму яўрэйскай спадчыны Валожына і Налібоцкага краю. Фотаздымкі, разнастайныя графічныя матэрыялы — усё тое, што таксама дапамагае больш поўна зразумець гэту паэтычную старонку спадчыны Валожына.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

■ Гэта цікава

# ПАД ГУКІ ПАЛАНЭЗА

## Знакаміты кампазітар-аматар Міхал Клеафас Агінскі не толькі пісаў музыку, але і інспектаваў мытні

**На гэту не вельмі вядомую акалічнасць у аўтабіяграфіі аўтара паланэза «лямінор», больш вядомага як «Развітанне з Радзімай», Дзяніс Іваноў звярнуў увагу пасля таго, як прыйшоў працаваць на Магілёўскую мытню. Малады спецыяліст па адукацыі гісторык, але пасля службы ў пагранвойсках сам лёс прывёў яго ў гэтае ведамства. Разам з тым і сваёй першай прафесіі ён не здраджвае. У вольны час падарожнічае па Беларусі і занатоўвае ўбачанае. Пасля таго, як некалькі гадоў таму пабываў у Залессі — былой рэзідэнцыі Міхала Клеафаса Агінскага і даведаўся пра яго мытныя справы, мэтанакіравана стаў шукаць у інтэрнэце і бібліятэках усё, што звязана з гэтым чалавекам. Высветлілася шмат цікавага.**



**Пра Залессе Дзянісу нагадвае кніга Сяргея Верамейчыка.**

### Пад уплывам Паўночных Афінаў

Хобі падарожнічаць з'явілася ў Дзяніса яшчэ ў студэнцкія гады — хацелася ўбачыць тыя мясціны, пра якія чыталі на лекцыях. З той пары ён ужо амаль усё аб'ехаў. Жартуе, што не паспеў толькі дэталёва даследаваць палескую глыбінку. Але ў яго яшчэ ўсё наперадзе. У выхадныя ён зноў збірае свой заплечнік, тыкае пальцам у карту і ідзе купляць квіток. Бо не любіць спланаваных паездак. У гэтым ёсць асаблівая асалода. Загадзя не ведаеш, што цябе чакае, з кім сустрэнешся. Часам яму складае кампанію яго калега па мытнай рабоце, а ў мінулым таксама выпускнік гістфака Антон Пусікаў — такі ж рамантык у душы і аматар спантанных прыгод.

Дзяніс і цяпер з захапленнем успамінае тое падарожжа ў Залессе, ці, як раней называлі сябры Агінскага гэты маёнтак, — Паўночныя Афіны. Ціхае ўтульнае месца з штучнымі вадаёмамі. «У 1817 годзе, калі Міхал Агінскі склаў з сябе паўнамоцтвы сенатара і вярнуўся ў свой маёнтак пад Смаргонь, ён зрабіў са сваёй беларускай рэзідэнцыі сапраўдную жамчужыну. Побач са старым палацам пабудаваў новы. Каля французскага парку разбіў яшчэ адзін у англійскім стылі, з утульнымі альтанкамі. Непадалёку размясціліся батанічны сад, заапарк, аранжарэя. Усе дарогі, якія вялі да Залесся, былі засаджаны дрэвамі. Сапраўды, райскі куточак. Ён знаходзіўся на шляху з Санкт-Пецярбурга ў Варшаву і служыў улюбёным месцам прыпынку для ганаровых і не вельмі гасцей. Тут заўсёды панавала музыка».

На жаль, ад былога хараства мала што засталося, але ёсць апантаныя сваёй справай людзі. «Пасля знаёмства з Сяргеем Верамейчыкам — старшым навуковым супрацоўнікам музея, я зусім па-іншаму зірнуў на Агінскага, — прызнаецца Дзяніс. — Мяне вельмі ўразіла гэта экскурсія».

На памяць аб той паездцы засталася аўтарская кніжка Сяргея Верамейчыка з дароўным надпісам. Даследчык у храналагічным парадку запісаў усе адметныя этапы жыцця дзяржаўнага дзеяча і таленавітага кампазітара і нават склаў свой варыянт яго радаводу. Захоплены ўбачаным і пачутым, шчаслівы падарожнік вярта ўся ў Магілёў узрушаны і зачараваны, у галаве ўзнёсла гучаў паланэз.

**«Агінскі не аднойчы бываў у Магілёве, сустракаўся з фаварытам расійскай імператрыцы Рыгорам Пацёмкіным. Той запрашаў яго ў сваю світу. Тут жа, у Магілёве, Міхал Клеафас прысягаў Кацярыне II».**

### Як Агінскі змагаўся са злоўжываннямі

Будучы выдатны палітычны дзеяч Рэчы Паспалітай, ганаровы член Віленскага ўніверсітэта, мяцежны ўдзельнік паўстання Тадэвуша Касцюшкі, сенатар Расійскай імперыі, тайны дарадца Аляксандра Першага Міхал Клеафас Агінскі пачынаў сваю кар'еру са скарбовага ўпаўнаважанага Літвы. У 21 год ён кантраляваў дзейнасць мытных пастоў на мяжы Літвы з Расіяй. Як чалавек вельмі тонкай палітычнай інтуіцыі, віртуозна арыентаваўся ў любых складаных сітуацыях. А яшчэ быў прынцыповым і рашучым, выяўляў злоўжыванні і пакідаў інструкцыі і распараджэнні. Вось толькі адзін факт, які сведчыць аб яго прыстойнасці і непрадузятасці. Вярнуўшыся ў Гародню, Міхал Клеафас публічна выкрыў злоўжыванні пры чаканцы новых медных манет, якія адбываліся па тайным распараджэнні пасла. Спробы камісіі падтрымаць пасла скончыліся нічым. Яны нават звярталіся да бацькі непакорнага ўпаўнаважанага. Той толькі напісаў сыну «...Не адступай ад шляху гонару і цноты. Палажыся на Бога, паважай законы, кіруйся ў дзеяннях сваім сумленнем». Закон быў на баку Міхала Агінскага, і пры галасаванні ён скарыстаўся сваім правам накласці вета.

— Уражвае, наколькі разумна і эфектыўна малады чалавек змог арганізаваць работу мытных органаў, — з веданнем справы кажа Дзяніс. — Ён падрыхтаваў справаздачу, у якой прадставіў свае заўвагі па зніжэнні выдаткаў і прапанаваў шэраг мер, каб пазбегнуць фактаў злоўжывання службовымі абавязкамі. У прыватнасці, кожны супрацоўнік мытнага Дэпартамента павінен быў выконваць пэўныя і размежаваныя абавязкі, суперінтэндантам (кіраўнікам) належала аб'язджаць мытні і пасты не чатыры разы на год, як таго патрабаваў закон, а рэгулярна. Каб супрацоўнікі не мелі магчымасці выкарыстоўваць грошы мытных кас у сваіх мэтах, малады дэпутат раіў увесці правіла здаваць грошы ў казну часцей, чым 2 разы ў год. Рэкамендаваў унесці ў тэкст прысягі мытнага чыноўніка пункт, згодна з якім кожны супрацоўнік абавязаны быў дакладваць кіраўніцтву аб фактах злоўжыванняў або падрыхтоўцы да іх. Усе гэтыя і іншыя парады былі прыняты да ведама. У 1788 годзе на эканамічнай сесіі ў Гродне быў прыняты і апублікаваны цэлы шэраг мытных інструктажоў Вялікага Княства Літоўскага. Скарбовая камісія плённа кіравала дзейнасцю мытнай службы княства, і тая прыносіла значны даход у казну дзяржавы.







### Бялынічы лічыліся «мясцовай Чэнстаховай»

З Магілёўскай вобласцю Міхала Клеафаса Агінскага наогул шмат што звязвае.

Нават настаўнік музыкі Восіп Казлоўскі быў родам з Прапойска (цяпер Слаўгарад). У 1821 годзе аўтар афіцыйнага гімна Расійскай імперыі «Гром победы, раздавайся», вяртаючыся з дачкой на радзіму ў Прапойск, некаторы час гасцяваў у свайго былога вучня ў Залессі.

**«Калі ведаеш сваю краіну, пачынаеш яшчэ больш яе любіць, адчуваеш сапраўднае, а не штучнае пачуццё патрыятызму».**

Сярод беларускіх уладанняў Агінскіх некалькі было і ў Магілёўскай губерні — у Бялынічах і на Мсціслаўшчыне. Пра гэта Дзяніс знайшоў шмат карыснай інфармацыі і ў кнігах свайго калегі па мытнай службе з Гродзеншчыны Віктара Саяпіна — той таксама сур'ёзна цікавіўся гісторыяй, нават ездзіў у польскія і літоўскія музеі і архівы.

— Агінскі не аднойчы бываў у Магілёве, сустракаўся з фаварытам расійскай імператрыцы Рыгорам Пацёмкіным. Той запрашаў яго ў сваю світу. Тут жа, у Магілёве, Міхал Клеафас прысягаў Кацярыне II, каб мець права на ўезд у свае беларускія ўладанні. У Бялынічах у яго была сядзіба, якая, на жаль, не захавалася. Цяпер на гэтым месцы парк. Дарэчы, пры Агінскіх тут таксама быў парк, які лічыўся помнікам садова-паркавага мастацтва. Дзякуючы гэтаму роду, Бялынічы сталі буйным рэлігійным цэнтрам, або, як тады казалі, «мясцовай Чэнстаховай». Менавіта намаганнямі Агінскіх тут быў закладзены касцёл у гонар Узнясення Божай Маці, вернуты выкрадзены падчас войнаў цудатворны абраз Божай Маці Бялыніцкай — святыні, ушанаванай вернікамі трох канфесій: праваслаўнымі, каталікамі і уніятамі, — расказвае Дзяніс.

### Падарожжы клічуць

Цікавасць калег па Магілёўскай мытні да яго падарожжаў прымушае Дзяніса, так бы мовіць, трымаць сябе ў форме. Нядаўна разам з Антонам Пусікавым яны пабывалі у Жыровічах, Слоніме, Ружанах, Косаве.

— Прыемна адчуць атмасферу горада, раёна, стасавацца з супрацоўнікамі музеяў, назіраць за жыццём горада, — кажа Дзяніс. — У нас шмат цікавых мясцін. Мне падабаюцца маленькія населеныя пункты, да якіх мала хто даязджае. З паездак прывожу магніты. На жаль, яны не ўсюды ёсць. А яшчэ раблю шмат фота, трэба ж нечым падмацоўваць уражанні. Мытня і гісторыя дапаўняюць адно аднаго. Той жа Агінскі і мытняй займаўся, і музыку добрую пісаў.

На Магілёўскай мытні цікавасць Дзяніса да гісторыі Беларусі многіх зачапіла за жывое. Калі ведаеш сваю краіну, пачынаеш яшчэ больш яе любіць, адчуваеш сапраўднае, а не штучнае пачуццё патрыятызму. А мытнік і патрыятызм — паняцці сугучныя.

Аудит включает в себя проведение аудиторских процедур, направленных на получение аудиторских доказательств, подтверждающих числовые показатели в консолидированной финансовой отчетности и раскрытие в ней информации. Выбор аудиторских процедур является предметом суждения аудиторской организации, которое основывается на оценке риска существенных искажений консолидированной финансовой отчетности, допущенных вследствие недобросовестных действий или ошибок. В процессе оценки данного риска аудиторская организация рассматривает систему внутреннего контроля, обеспечивающую составление и достоверность консолидированной финансовой отчетности, с целью выбора соответствующих аудиторских процедур, но не с целью выражения мнения об эффективности системы внутреннего контроля. Аудит также включает в себя оценку надлежащего характера применяемой учетной политики и обоснованности оценочных показателей, полученных руководством аудируемого лица, а также оценку представления консолидированной финансовой отчетности в целом.

Мы полагаем, что полученные в ходе аудита аудиторские доказательства представляют достаточные и надлежащие основания для выражения нашего мнения.

*Аудиторское мнение*

По нашему мнению, консолидированная финансовая отчетность отражает достоверно во всех существенных отношениях финансовое положение Открытого акционерного общества «Белвнешэкономбанк» и его дочерних компаний по состоянию на 31 декабря 2015 г., его финансовые результаты и движение денежных средств за 2015 год в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности.

Лащенко П.А.
Партнер, FCCA
Директор ООО «Эрнст энд Янг»
9 марта 2016 г.

**Сведения об аудируемом лице**

Наименование: Открытое акционерное общество «Белвнешэкономбанк» (ОАО «Банк БелВЭБ»)
Открытое акционерное общество «Белвнешэкономбанк» зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 12 декабря 1991 г., регистрационный № 24.
Местонахождение: 220004, Республика Беларусь, г. Минск, пр-т, Победителей, 29.

**Сведения об аудиторской организации**

Наименование: Общество с ограниченной ответственностью «Эрнст энд Янг»
Свидетельство о государственной регистрации № 577, выданное Минским городским исполнительным комитетом 7 апреля 2005 г.
Местонахождение: 220004, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Клары Цеткин, 51а, 15 этаж.

# ВЯРТАННЕ НА «ПРАРАДЗІМУ»

## ЦІ МАГЧЫМА АДРАДЖЭННЕ АФРЫКІ?



**Шэраг аналітыкаў кампетэнтна сцвярджаюць: у найбліжэйшай перспектыве нам давядзецца пазнаёміцца з «афрыканскімі львамі», якія прыйдуць на змену «азіяцкім тыграм». Краіны Чорнага кантынента спадзяюцца паўтарыць лёс Паўднёвай Карэі або Сінгапура, якія здзейснілі сапраўдны прарыў у эканамічным развіцці. Дэмографы прагназуюць, што да 2050 года ў Афрыцы будзе жыць як мінімум 2 мільярды чалавек. Яны складуць чвэрць усёй працоўнай сілы планеты. Спецыялісты адзначаюць, што эканамічны бум дазволіў істотна палепшыць жыццё ў многіх афрыканскіх краінах. Зніжаюцца дзіцячая смяротнасць, непісьменнасць і ўзровень СНІДу, а працягласць жыцця вырасла на 10 працэнтаў. Праўда, існуе, так бы мовіць, і адваротны бок медаля — каласальныя кантрасты ва ўзроўні жыцця. Большасць з 48 краін, якія знаходзяцца на поўдзень ад Сахары, працягваюць займаць апошнія месцы ў свеце па даходах жыхароў. Калі ж паўстануць тыя самыя «афрыканскія львы»?**

### СТРАТЭГІЧНАЕ МЕСЦА

Спачатку да каранёў. Першапачаткова словам «афры» жыхары старажытнага Карфагена вызначалі людзей, якія пасяляліся непадалёк ад горада. Гэтую назву звычайна адносяць да фінікійскага «afar», што значыць «пыл». Пасля заваявання Карфагена рымляне назвалі правінцыю Афрыкай. Пазней так пачалі абазначаць і ўсе вядомыя рэгіёны гэтага кантынента, а потым і сам кантынент. Іншая тэорыя сцвярджае, што назва народа «афры» пайшла ад берберскага «ifri»(«пячора») і мае на ўвазе пячорных жыхароў. Цікава, што мусульманская правінцыя Іфрыкія, якая ўзнікла тут пазней, таксама захавала гэты корань у сваёй назве. На думку гісторыка, археолага і пісьменніка Івана Яфрэмава, слова «Афрыка» прыйшло са старажытнай мовы Тая-Кім — ад «Афрас» — «пенная краіна». Гэта звязана з цікавай прыроднай з'явай — сутыкненнем некалькіх відаў плыняў, якія ўтвараюць вялікую пену ў Міжземным моры пры набліжэнні да кантынента.

Афрыка па праву лічыцца «прарадзімай чалавецтва». Менавіта тут знойдзены астанкі самых старажытных відаў роду Homo. З васьмі вядомых вучоным відаў гэтага роду выжыў толькі адзін — Homo sapiens (чалавек разумны). Тысячы «сапіенсаў» пачалі рассяляцца па тэрыторыі Афрыкі каля 100 тысяч гадоў таму. А ўжо адсюль людзі мігравалі ў Азію (каля 60-40 тыс. гадоў назад), а адтуль — у Еўропу (40 тыс. гадоў), Аўстралію і Амерыку (35 -15 тыс. гадоў). Як бачым, «схемы перасялення» пачыналіся з Чорнага кантынента спрадвек.

Месца тут насамрэч стратэгічнае. Другі па плошчы кантынент на планеце (пасля Еўразіі) абмываецца Міжземным морам з поўначы, Чырвоным — з паўночнага ўсходу, Атлантычным акіянам з захаду і Індыйскім з усходу і поўдня. Гэта пятая частка сушы — плошча Афрыкі разам з астравамі складае больш чым 30 мільёнаў квадратных кіламетраў. Гэтая тэрыторыя, з яе велізарнымі запасамі карысных выкапняў, каласальным рынкам для збыту тавараў і шматлікай працоўнай сілай, не распешчанай вялікімі грашыма, з'яўляецца прывабнай здабычай для сусветных дзяржаў ужо на працягу доўгага часу. З XVII па XX стагоддзе амаль увесь кантынент быў «распілаваны» паміж тагачаснымі галоўнымі каланіяльнымі гульцамі — сваю дзяржаўную лапу на тыя ці іншыя афрыканскія землі наклалі Францыя, Вялікабрытанія, Іспанія, Партугалія, Італія, Германія. У другой палове XX стагоддзя Чорны кантынент выбухнуў нацыянальна-вызваленчымі рэвалюцыямі. Пасля Другой сусветнай вайны хутка пайшоў працэс дэкаланізацыі Афрыкі.

Годам Афрыкі — часам вызвалення найбольшай колькасці калоній — стаў 1960-ты. Тады незалежнасць атрымалі 17 дзяржаў. Большасць з іх — французскія калоніі і тэрыторыі, якія знаходзіліся пад кіраваннем Францыі: Камерун, Тога, Малагасійская Рэспубліка, Конга (былое Французскае Конга), Дагамея, Верхняя Вольта, Бераг Слановай Косці, Чад, Цэнтральна-Афрыканская Рэспубліка, Габон, Маўрытанія, Нігер, Сенегал, Малі. Незалежнымі былі абвешчаны самая буйная краіна Афрыкі па колькасці насельніцтва — Нігерыя, якая належала Вялікабрытаніі, і самая вялікая па тэрыторыі — Бельгійскае Конга. Брытанскае Самалі і Самалі, якое знаходзілася пад кіраваннем Італіі, былі аб'яднаны і сталі Самалійскай Дэмакратычнай Рэспублікай.

Цяпер на кантыненце размешчана 55 краін, 4 непрызнаныя дзяржавы і 5 залежных тэрыторый (астраўных). У 1963-м была створана Арганізацыя афрыканскага адзінства. Гэтая арганізацыя 9 ліпеня 2002 года была афіцыйна пераўтворана ў Афрыканскі саюз (АС). Зараз у яго ўваходзяць 54 краіны. У АС не ўваходзіць толькі Марока — у знак пратэсту супраць прыняцця ў яго склад Заходняй Сахары, якую Марока лічыць сваёй тэрыторыяй.

### ЛЮСТЭРКА СУСВЕТНАЙ ЭКАНОМІКІ

«Афрыка — люстэрка сусветнай эканомікі, у якім, як заўсёды, суцэльныя праблемы», — адзначае дырэктар аналітычнага дэпартамента ВК «Golden Hills-КапиталЪ АМ» Міхаіл Крылоў. Летась гадавы валавы ўнутраны прадукт Афрыкі складаў каля 2,3 трыльёна долараў, з якіх большасць — 72 працэнты — прыпадала на Нігерыю, Паўднёва-Афрыканскую Рэспубліку (ПАР), Егіпет, Алжыр, Анголу і Марока. Тармажэнне росту эканомікі Нігерыі да 2,1% у год і ПАР да 0,6% з-за нізкіх цэн на сыравіну кампенсавалася паскарэннем у Егіпце да 4,5%, Алжыры — да 3,9%, Анголе — да 4,9%, Марока — да 4,7%, у асноўным на турыстычнай і іміджавай падтрымцы рэгіёна з боку былых каланіяльных дзяржаў.

Рэгіянальныя лідары паспяхова развіваліся пры высокіх працэнтных стаўках (12% у Нігерыі, 10,75% у Егіпце і 14% у Анголе) і ўзроўнях інфляцыі (12,8% у Нігерыі, 9% у Егіпце і 23,6% у Анголе). Стабільнасці не перашкаджала нават павышэнне ўзроўню беспрацоўя да 10,4% у Нігерыі, да 24,5% (!) у Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы, да 12,8% — у Егіпце і да 26% (!) — у Анголе.

«Галоўная праблема Афрыкі — гэта рэкет, бандыцкія групоўкі, крымінальны сектар эканомікі. Карупцыя



ў эканоміцы, — працягвае Міхаіл Крылоў, — прыводзіць да безадказнага нарошчвання крэдыту часовымі кіраўнікамі». У сілу маладосці дзяржаўнасці частка паспяховых афрыканскіх краін слаба закрэдытаваная (дзярждоўг да ВУП Алжыра — 8,8%, Нігерыі — 10,5%), але для большасці гэтых дзяржаў менавіта доўг уяўляўся асноўнай праблемай. Дзярждоўг Туніса да ВУП — 47,5%, Танзаніі — 39,9%, Судана — 79%, Ганы — 67,6%, Мазамбіка — 55,4%.

Канцэнтрацыя насельніцтва і эканамічных рэсурсаў, перш за ўсё зямельных, у буйных эканоміках Афрыкі, а таксама спецыфічны афрыканскі кліентэлізм (мадэль грамадства, пабудаваная на ўзаемаадносінах «патрон-кліент») дазвалялі нівеляваць сістэмную пагрозу захопу эканомікі замежнымі крэдыторамі. «Яны проста не разумелі, каму даць хабар, каб трансфармаваць удзел у прыбытковых сумесных прадпрыемствах, — кажа эксперт. — Зрэшты, у тых краінах, дзе эканоміка паспяхова расла, сакрэт заключаўся якраз альбо ў прыродных багаццях (нафта ў Нігерыі, алмазы і золата ў ПАР, клімат Міжземнамор'я), альбо ва ўдзеле буйнога капіталу, як правіла, з Кітая».

На думку эксперта, выходзіць на афрыканскі рынак варта толькі з гатоўнасцю працаваць з прыцэлам на далёкую будучыню — на дзесяцігоддзі наперад. Справа ў тым, што ў Афрыкі велізарны нераскрыты патэнцыял — і ў плане чалавечых рэсурсаў, і ў плане прыродных рэсурсаў, і ў плане патэнцыйнага рынку збыту. Узровень жыцця насельніцтва кантынента цягам наступных дзесяцігоддзяў будзе павышацца, будзе расці плацежаздольны попыт, развівацца прамысловасць і інфраструктура. У Афрыцы вельмі танная рабочая сіла: у перспектыве яна можа стаць магутнай вытворчай базай, як калісьці стаў Кітай дзякуючы сваёй таннай рабочай сіле.

### «ЦУД» НА ВЫКАПНЯХ?

Майскі нумар аўтарытэтнага эканамічнага часопіса The Economist у 2000 годзе выйшаў з выявай на чорнай вокладцы ўзброенага гранатамётам афрыканца на фоне абрысаў Афрыкі. У песімістычным артыкуле яна называлася «безнадзейным кантынентам», які раздзіраюць вечныя міжплемянныя войны, голад і ўсеагульная беднасць. З моманту выхаду таго часопіса прайшло больш за паўтара дзесяцігоддзя. За гэты час карціна змянілася. Колькасць войнаў на кантыненце скарацілася, зменшыліся голад і беднасць.

**Чорны кантынент умудрыўся абмінуць эпоху індустрыялізацыі і апынуўся адразу ў лічбавым стагоддзі. Свабодны доступ да інфармацыі, у сваю чаргу, стымулюе развіццё эканомікі.**



Казаць, што з безнадзейнага Афрыка ператварылася ў квітнеючы кантынент, пакуль што яшчэ зарана, але можна смела сцвярджаць, што на Чорным кантыненце адзначаецца эканамічны бум. Не дзіўна, што песімісты, якія на мяжы стагоддзяў прадказвалі Афрыцы ледзь не поўны калапс, цяпер усё больш гучна прагназуюць ёй адраджэнне. Галоўным здабыткам Афрыкі, акрамя маладога па ўзросце насельніцтва і рынкаў, якія хутка растуць, несумненна, з'яўляюцца прыродныя багацці. Па карысных выкапнях яна далёка абышла ўсе астатнія кантыненты. Дастаткова сказаць, што ў яе нетрах знаходзіцца амаль 40 працэнтаў карысных выкапняў усёй планеты. Вельмі вялікі аграпрамысловы патэнцыял Афрыкі — на яе тэрыторыі знаходзяцца 60 працэнтаў усіх неапрацаваных сельскагаспадарчых зямель планеты.

Наперадзе планеты ўсёй Чорны кантынент і па тэмпах прамысловага развіцця. Рэальны рост эканомікі за мінулыя дзесяць гадоў вагаўся ад 5% да 10%, а ў багатых на нафту краінах, напрыклад Анголе, склаў у 2007 годзе рэкордныя 22,6%. Паводле даследавання Сусветнага банка, 17 з 50 эканомік, якія развіваюцца найбольш высокімі тэмпамі, знаходзяцца ў Афрыцы. Гэта не толькі кантынент, які найбольш дынамічна развіваецца. Ён таксама дае цяпер шмат магчымасцяў для інвестараў.

Не дзіўна, што інвестары робяць новае адкрыццё Афрыкі, а інвестыцыйныя фонды, якія спецыялізуюцца на прыродных рэсурсах, харчаванні і ворнай зямлі, абяцаюць астранамічныя, асабліва па цяперашніх часах, працэнты. Гэта дало гісторыкам падставу казаць пра другое адкрыццё і падзел Афрыкі, супастаўным з «афрыканскімі гонкамі» XIX стагоддзя, калі еўрапейскія каланіяльныя ўлады падзялілі кантынент і пачалі рабаваць яго прыродныя рэсурсы. Вядома, цяпер не XIX стагоддзе і спосабы пранікнення сталі больш далікатнымі, аднак мэты не змяняюцца.

На ўсім кантыненце будуюцца аўтастрады, чыгункі, аэрапорты, плаціны, фабрыкі і заводы, электрастанцыі і многае іншае. У афрыканскіх мегаполісах — такіх, як Лагос, Адыс-Абеба, Найробі — як грыбы пасля дажджу адкрываюцца прамысловыя паркі і спецыяльныя эканамічныя зоны. Многія афрыканцы цяпер адчуваюць сябе нашмат больш упэўнена, чым паўстагоддзя таму, калі Афрыка толькі пачала набываць незалежнасць.

У інфармацыйным і камунікацыйным сектарах адбываюцца сапраўдныя рэвалюцыі. Чорны кантынент умудрыўся абмінуць эпоху індустрыялізацыі і апынуўся адразу ў лічбавым стагоддзі. Свабодны доступ да інфармацыі, у сваю чаргу, стымулюе развіццё эканомікі, умацоўвае грамадзянскую супольнасць і вядзе да змен у грамадстве, асабліва прыкметных у буйных гарадах. У авангардзе ўсіх гэтых працэсаў — новы сярэдні клас, колькасць якога Афрыканскі банк развіцця ацэньвае ў 310 млн чалавек. Амаль столькі ж, нагадаем, складае насельніцтва Злучаных Штатаў.

Вядома, шэраг аналітыкаў справядліва лічаць, што за цяперашнім афрыканскім «цудам» стаяць галоўным чынам высокія цэны на карысныя выкапні і яно паляпшае жыццё толькі вышэйшых класаў. У такіх багатых на рэсурсы краінах, як Ангола і Габон, мясцовыя жыхары нярэдка бачаць у гэтых рэсурсах не благаслаўленне, а пракляцце. Блізкія да ўлады казачна багацеюць, а тыя, хто ад яе далёкі, па-ранейшаму гібеюць у беднасці. Афрыку з поўным правам можна назваць кантынентам кантрастаў. Мільёны афрыканцаў па-ранейшаму кладуцца спаць галоднымі, мільёны пакутуюць ад эпідэмій і хвароб. Нягледзячы на тое, што эканамічны бум рэальна існуе, эканамісты раяць не ўпадаць у эйфарыю. Афрыканскія краіны, якія здолелі наблізіцца да сярэдняга сусветнага ўзроўню жыцця, можна пералічыць па пальцах. Так што, заўважаюць спецыялісты, параўнанне з азіяцкімі тыграмі афрыканскіх ільвоў, як мінімум, заўчаснае. Прынамсі, пакуль.

**Захар БУРАК.**
*burak@zviazda.by*

■ Хто каго?

# «...ІМ — НЯХАЙ ПАДОЛ ГАРЫЦЬ, АЛЕ Ж ДАЙ ПАГАВАРЫЦЬ»

**Што было — было. Адна пажылая (бо пажыла ж...) вяскоўка ў горад на зіму пераехала — да сваёй дачкі. А дачка ж не нявестка. Добра бабулі: смачна есць, доўга спіць, зрэдчас для «размінкі» на зяця пасварыцца, у двары на лавачцы пасядзіць...**
**Дык вось. Неяк раз вяртаецца адтуль і адразу ж да тэлефона: давай у вёску званіць, давай хваліцца, што ў яе тут, здаецца, грэйпфрут з'явіўся!**
**— Хто-хто? — не разумее сяброўка.**
**Дачка з-за спіны:**
**— Мама, не грэйпфрут, а бойфрэнд!**

І сапраўды, дзеўкі, жанкі цяпер кавалераў гэтак завуць, хоць слоўца і не наша — грувасткае: людзям у гадах яго цяжка запомніць. (З той жа «оперы» — анекдот. Бабуля да ўнучкі: «Дзіцятка, нагадай мне, як завуць таго немца, з-за якога я розум трачу?» — «Альцгеймер, бабуля, Альцгельмер!»...)

І гэта, магчыма, смешна было б, калі б не было так сумна.

А зрэшты, усё змяшалася, як той казаў — і ў гэтым анекдоце, і ў нашай конкурснай пошце, бо, глянуўшы на верхні здымак, яно ж, згадзіцеся, цяжка не ўсклікнуць:

*Эх, жыццё было даўно:*
*Што ні вечар — то кіно!*
*А цяпер — ляжы на печы...*
*Ці сядзі — глядзі ў акно.*

Можна паспрачацца са **спадарыняй Аленай Кулік з вёскі Нелюбы Валожынскага раёна**, сказаць, што ёсць яшчэ, дзякаваць Богу, кнігі, інтэрнэт і экраны тэлевізараў, ёсць сямейнікі, якіх трэба глядзець, ёсць гаспадаркі-гароды, захапленні... Але рацыя ў словах Алены — таксама, бо не з неба ж зваліўся конкурсны здымак — у многіх мясцінах і сапраўды (паводле **спадарыні Валянціны Гудачковай з Жыткавіч**):

*Дзе была кінарэклама,*
*Засталася толькі «рама»...*
*Хто ж паедзе і адкуль*
*Фільм круціць для дзвюх бабуль?*

А тым больш што іх, гэтых самых бабуль, дзядуляў (як, дарэчы, і людзей нашмат маладзейшых), трэба яшчэ добра пастарацца, каб... з той «печы зняць». **Спадар Мікалай Старых з Гомеля**, мусіць, паспрабаваў? Бо інакш, гледзячы на здымак, наўрад ці «пачуў» бы ад адной з кабет цалкам лагічнае тут:

*Я ў клубе ўжо не госць,*
*Бо кіно — і дома ёсць: .*
*З паўсяны тэлеэкран,*
*У «Звяздзе» — вагон праграм:*
*Там камедыя, там — драма,*
*Там хакей і «Панарама»,*
*А ўжо фільмаў пра каханне...*
*Круцяць з вечара да рання!*

Што важна — «з дастаўкай» дахаты, нікуды ісці не трэба. Да таго ж Генадзь Хазанаў неяк рытарычнае пытанне задаў: «Ці можна ў Вялікім тэатры парыць ногі?» І сам жа на яго адказаў: «...А перад тэлевізарам — можна». Значыць, сядзі сабе і глядзі. Прычым — дзень пры дні, гадамі, бо ў той жа праграме незлічона, можна сказаць, не проста фільмаў, а серыялаў кшталту «Санты-Барбары»: усе забыліся, калі яна (нейкая чарговая...) пачалася і ніхто не ведае, калі скончыцца... (Два анекдоты ў тэму. «Доктар, ну як я?» — пытаецца хворы пасля аперацыі. Першы варыянт адказу: «Можаце браць крэдыт» — «А як аддаваць?» — «Аддаваць не прыйдзецца»... Другі — «Новыя серыялы глядзець не пачынайце»...)

Але ж, бывае, зачэпішся вокам за экран і «ўліпнеш», бо, як піша **спадарыня Гудачкова**:

*Што кіно...*
*Кабетам сталым*
*Даспадобы серыялы:*
*Што адна не так убачыць,*
*То другая — растлумачыць.*

А значыць, сустрэўшыся, ім ёсць аб чым пагаманіць. Да таго ж абедзве ўвесь час пры справе...

Іншая размова — наколькі яна, тая справа, карысная, бо...

Неяк хвілін праз дзесяць пасля пачатку фільма глядач з кінатэатра выскачыў, да афішы пакіраваў, прачытаў там: «Дзеці да 16-ці не дапускаюцца» і прызнаў: «Шчаслівыя...»

Як, магчыма, і гэтыя дзве кабеткі, бо (паводле спадарыні Валянціны) яны,

*Баба Маня з бабай Таняй*
*Не сумуюць па экране.*
*Цікавей усё адно*
*Жыць!..*
*Не пяліцца ў кіно!..*

Трэба разумець, з ранку да вечара?

А вось нешта людскае — да таго ж на вялікім экране, зрэдчас — паглядзець можна. Ды што там — дзеля гэтага нават кампанію добра сабраць! Як некалі... Ці як маладыя цяпер — тэлефануюць адзін аднаму, дамаўляюцца аб сустрэчы, ідуць у кінатэатр... (Было, кажуць: там, падчас прагляду фільма, гук прапаў. Нехта адразу ў крык: «Эй, у каго там пульт?!»)

Трэба думаць, што прыладу гэту хутка знайшлі. А вось на кампанію не ўсім шанцуе. Адна з гераінь здымка (спадарыня Алена Кулік не ўдакладняе, каторая — тая, што справа ці злева?) паспрабавала яе сабраць, а другая – паглядзіце на здымак — якраз пытаецца:

*— Што, Пятроўна, тут стаім?*
*Кажаш: у кіно схадзіла б?*
*Толькі з Федзем са сваім?*
*Ці Івана запрасіла?*

На Валожыншчыне, выходзіць, ёсць мужчыны!.. Ёсць нават выбар!

Аб іншых населеных пунктах гэтага не скажаш. «Уважліва паглядзеўшы на здымак, — піша, прынамсі, **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў**, — я вырашыў, што гэтыя жанчыны свараца, прычым вельмі даўно і не на жарт».

З-за чаго? З-за каго? Ну вядома ж: шукайце... мужчыну!

*Калі клуб наш закрывалі —*
*Штосьць прадалі, што спісалі:*
*Быў загад начальніка...*
*А жанчынам як тут быць?*
*Як на ўсіх ім падзяліць*
*Кіншчыка-механіка?!*

І сапраўды: калі ён, той кіншчык, мужчына і добры гаспадар, то ў кабет — праблема. Прычым — не жартоўная. Як яе вырашыць, ведае хіба **спадарыня Галіна Пятроўская з вёскі Ардашы Смаргонскага раёна**, якая ад імя адной жанчыны кажа другой (і многім іншым):

*Ой суседка дарагая,*
*Кавалер у нас адзін.*
*Ты раўнуеш, я раўную...*
*Давай лепей прададзім!*

Сучасны падыход, згадзіцеся — рынкавы. Да таго ж жанчыны сказалі — жанчыны зробяць. А грошы, трэба разумець, падзеляць? **Спадарыня Любоў Чыгрынава** ведае, на што іх можна патрацiць:

*Па аб'явах баба Вера*
*Усё шукае кавалера*
*Каб — з заможных,*
*Вельмі модных,*
*Каб не меў ён*
*Звычак шкодных...*
*Ды такія кавалеры*
*Не яе штурмуюць дзверы.*

Сумнае кіно. А што да кавалераў, то ёсць у акрузе іншыя, але ж іх — **паводле спадара Міколы Кісяля з Мінска** — баба Вера «не разглядае», у разлік не бярэ, бо:

*Ну і лянівец гэты Міша! —*
*Смалячкоў не мае:*
*Кожны дзень сабе... афішы*
*На падпал здзірае!*

А з імі, з афішамі, трэба разумець, і шлюбныя абвесткі... У выніку на «грэйпфрута» бабе Веры спадзявацца цяжка — шанцаў амаль няма. Ці ўсё ж такі ёсць? І пакідаюць іх **сужэнцы Астроўскія з Мінска**:

*За мастацтва ўжо даўно*
*У нас важнейшае кіно...*
*Ды жывуць паблізу цёткі*
*Ну і мастачкі ж плесці... плёткі!*
*Ім — няхай падол гарыць,*
*Але ж дай пагаварыць,*
*Потым — чутку-пагалоску*
*Як... кіно — пусціць па вёску.*

А ўжо там усе чыста яго «ўбачаць», усе чыста пачуюць, бо (на думку **спадара Анатоля Гарачова з Іўеўшчыны**):

*За сабой пакінуць след*
*Можна і на хутары.*
*Як адключаць інтэрнэт,*
*Дык і так пагутарым.*

Трэба разумець, не ўсе яшчэ развучыліся — умеюць размаўляць. І слухаць таксама звычка засталася, асабліва — у сталых вяскоўцаў.




Адкуль гэтыя каштоўныя ўменні браліся, развазвае **спадар Гаўрыш**. «Некалі прачынаешся, — піша ён, — і з самага ранку чуеш галасы. Гэта радыё ў хаце гамоніць: нешта распавядае табе, навіны перадае, песні спявае. Быццам, жывыя людзі паблізу...»

Праўда, былі, — як зазначае чытач, — бо цяпер тое праваднoе радыёвяшчанне пакінулі гэты свет... Як недзе (і па ўважлівых прычынах) школы, крамы, клубы... Што ёсць, тое ёсць. Але ж нават у гэтых выпадках і населеных пунктах, на думку **спадара Валерыя**, страчана не ўсё, бо:

*Шмат хто едзе ў горад жыць, —*
*Кліча даль туманная...*
*Але і вёсцы нашай — быць,*
*Покуль радыё гучыць...*
*Хай і сарафаннае!*

Адну з яго «перадач", гледзячы на здымак, «агучыла», так бы мовіць, **спадарыня Соф'я Кусянкова з вёскі Лучын Рагачоўскага раёна**:

*— Чуй, кума, гутораць людзі,*
*Што «кіна ўдзень не будзе»:*
*Кіншчык з жонкай пасварыўся,*
*І праз тое — у дым напіўся.*
*Рачкі поўзае па сенцах —*
*Чыстае кіно і немцы!*
*Вось пайду — яго палаю:*
*Дзе «Вяртанне Будулая»?!*

І сапраўды: жанкі могуць дараваць многае, але ж не гэта!

І зрабіць могуць бог ведае што. **Спадар Гаўрыш** піша: «Нам, мужчынам адзенне — нават на жанчынах — як правіла, да лямпачкі. А вось жанчынам — не. Ва ўсякім разе жонка мая, убачыўшы здымак, тут жа зглядзела, што адна з кабет — прыбраўшыся, а другая — у будзённым...

Адсюль мае радкі:

*Сто задумаў, як відно,*
*У кабет няхворых:*
*Ганну цягне ў кіно,*
*Клаву — шыць уборы.*

І гэта, зазначым, за шчасце. Бо, як лічыць **спадарыня Лосева з Навагрудчыны**, можа пацягнуць яшчэ і не туды:

*Дзве жанчыны з вёскі Верас*
*Ад'язджаюць у... Лас Вегас:*
*Не вязуць, маўляў, кіно, —*
*Паляцім у... казіно.*

Кажаце, што не было ў Лас-Вегасе такіх гульцоў? Значыць, будуць! А ўжо з грашыма адтуль вернуцца ці без... Неяк, расказвалі, старшыня калгаса сеў у карты гуляць са сваім кіроўцам — і раз, і два, і тры... Старшыня той картуе і картуе, бо ўвесь час «у дурнях» сядзіць. Кіроўца яму:

«Ну што ж вы так, Пятровіч... Сканцэнтруйцеся, уключыце мазгі. Гэта ж вам не калгасам кіраваць... Тут думаць трэба».

У казіно, зазначым, таксама... Як, дарэчы, і ў нашым конкурсе на лепшы подпіс да здымка.

...Дык «хто ж каго?» — перамудрыў, перасягнуў на папярэднім этапе?

Вялікае чытацкае журы найвышэй адзначыла прыдумкі **спадароў Анатоля Гарачова з Іўеўшчыны, Валерыя Гаўрыша з Чавусаў, сужэнцаў Астроўскіх з Мінска, гуртоўцаў «Спроба пяра» СШ №3 г. Вілейкі, спадарынь Валянціны Гудачковай з Жыткавіч, Раісы Васільевай з Гомеля і Любові Чыгрынавай**...

З гэтым, апошнім, меркаваннем, пагадзілася і журы маленькае рэдакцыйнае. А значыць, прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцу газету «Звязда» застаецца ў Мінску.

Хочаце, каб яна — старэйшая, адзіная (сярод штодзённых) беларускамоўная, – пяць разоў на тыдзень прыходзіла да вас? Тады варыянтаў два: першы — аформіць падпіску, другі — уважліва паглядзець на новы конкурсны здымак, падумаць, што гэта значыла б, і напісаць. Варыянтаў подпісу можа быць шмат, але кожны з іх — не больш за восем радкоў, прычым — трапных, дасціпных, прыгожых... Поспехаў!

**Валянціна ДОЎНАР,**
*dounar@zviazda.by*
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**




***АД ІХ ЖА шчырыя прабачэнні ўсім, чые варыянты не прайшлі строгага конкурснага адбору — гэтым разам. А ўжо наступным...***

***Пішыце і, як вучыла знаёмая жабка, не здавайцеся: вам пашанцуе!***

# «БЫЦЬ ТРЭНЕРАМ — ГЭТА МОЙ ЛЁС»

## Як выхаваць чэмпіёна, чаму перамагае Азаранка, і які на самай справе чалавек Марыя Шарапава. Уладзімір Валчкоў — пра сакрэты вялікага спорту

**Беларускі тэніс заўсёды славіўся асобнымі імёнамі, спачатку запальваліся адны «зоркі», услед за імі з'яўляліся іншыя. Наш сённяшні герой не толькі ўнёс значны ўклад у развіццё гэтага віду спорту ў краіне, але і актыўна прасоўваў Беларусь на сусветных арэнах. Будучы гульцом Уладзіатар, менавіта так яго звалі ў тэнісных колах, даходзіў да фіналаў самых прэстыжных тэнісных турніраў у адзіночным разрадзе, паспяхова выступаў у пары. У прыватнасці менавіта ён разам з Максімам Мірным вывеў Беларусь у элітную групу Кубка Дэвіса. А потым, калі з вялікім спортам прыйшоў час развітвацца, Уладзімір Валчкоў, здаецца, узяў для сваёй кар'еры дадатковы сэт. Спачатку заняўся юнымі тэнісістамі, потым папрацаваў з сусветнымі «зоркамі», а цяпер вярнуўся на радзіму і развівае акадэмію тэніса ў Беларусі. У інтэрв'ю карэспандэнту «Звязды» Уладзімір расказвае пра сваё сапраўднае прызначэнне, шанцы Вікторыі Азаранкі на Алімпійскіх гульнях і называе час, калі мы пачуем новыя беларускія імёны ў эліце сусветнага тэніса.**



***— Уладзімір, нядаўна нашы дзяўчаты выйшлі ў Сусветную групу Кубка федэрацыі. Вы гэтага чакалі?***

— Я сказаў бы, што нарэшце аднаўлена спартыўная справядлівасць, таму што месц такога гульца, як Віка Азаранка і не быць у Сусветнай групе — гэта па меншай меры дзіўна. Пры тым што ў жаночай камандзе ў нас ёсць яшчэ вопытная Вольга Гаварцова, паступова падымаецца Аляксандра Сасновіч, з'явіліся добрыя юніёркі — Вера Лапко і Арына Сабаленка. Таму такі вынік быў заканамерным, гэта выдатна, што дзяўчаты змаглі зрабіць добры крок наперад. Беларускі вартыя таго, каб гуляць на вялікіх арэнах з моцнымі камандамі.

**«За апошнія гадоў 15 у тэніс прыходзілі не дзеці, а іх бацькі».**

***— Калі жаночы тэніс у краіне прагрэсуе, то мужчынскі пакуль стаіць на месцы...***

— Трэба паўтара-два гады, і мы выйдзем прыкладна на падобныя рубяжы з мужчынамі. Я шчыра ў гэта веру, і ў мяне ёсць падставы. За наступныя паўтара-два гады мы атрымаем гульца топ-100, а можа і двух такіх тэнісістаў. Вы ведаеце іх імёны, але я не хачу агучваць іх, каб не выдаваць раней часу авансы. Цяпер паміж мужчынамі ў нас вельмі добрая канкурэнцыя і пераходзіць з той групы, у якой мы гуляем зараз, у наступную адназначна трэба, а пры спрыяльнай сетцы, можна разлічваць на прасоўванне далей.

***— Калі глядзець у цэлым сітуацыю, беларусы любяць тэніс?***

— Адназначна! Беларусы сочаць, чакаюць добрых вынікаў, і сёння мы бачым, як кожная вялікая перамога Вікторыі адгукаецца ў каментарыях у інтэрнэце, у сродках масавай інфармацыі. Ад гэтага хочацца даваць нашым заўзятарам яшчэ больш станоўчых эмоцый. У цэлым рух тэніса ў нас дастаткова добры, за апошнія два гады, думаю, мы не зрабілі ніводнай вялікай памылкі, ніводнага сур'ёзнага праколу. Няхай мы, можа, набіраем абароты дастаткова плаўна, але галоўнае, што рухаемся ў правільным кірунку. Пра гэта сведчаць нашы вынікі на ўсіх узроўнях.

***— У краіне не так даўно пачала працаваць акадэмія тэніса. Ад яе існавання ўжо ёсць вынікі?***

— Мы не будзем прыклейвацца да вынікаў Вікі і Макса Мірнага, але ўсё астатняе, што адбываецца на ўзроўні нацыянальнай каманды і бліжэйшага рэзерву, — гэта заслуга акадэміі. Сёння пад нашым дахам ёсць стан высокай унутранай канкурэнцыі і паміж спартсменамі, і паміж трэнерамі, і паміж узроставымі групамі. Гэта добры рухавік, які стварае правільнае напружанне для развіцця.

***— Тое, што вялікі тэніс дарагі від спорту, — міф ці рэальнасць?***

— Я буду казаць аб тым, што адбываецца ў нас у акадэміі. Дзеці тут атрымліваюць добры трохразовы трэніровачны працэс абсалютна бясплатна. Што тычыцца іншых месцаў, нейкіх секцый, абанементаў, напэўна, ёсць заняткі, якія камусьці па кішэні, камусьці — не. Але, ведаеце, тэніс таннейшы за хакей, у які дзеці ідуць павальна.

***— Як дзіця можа трапіць у акадэмію тэніса?***

— На жаль, нельга ахапіць неабсяжнае, у рэжыме акадэміі ў нас самыя малодшыя — гэта зборная да 16 гадоў. Ёсць крытэрыі адбору, якія зацверджаны галоўным трэнерскім саветам. Два разы на год, па выніках зімовага і летняга першынства краіны, трэнеры прапануюць на зацвярджэнне склад спартсменаў, якія будуць запрошаны ў акадэмію.

***— У вашым дзяцінстве сітуацыя была іншая?***

— Вядома, таму што культура спорту была іншай, людзі прыходзілі з іншымі ідэямі і матывацыяй. За апошнія гадоў 15 у тэніс прыходзілі не дзеці, а іх бацькі. Можна было прыйсці ў любы тэнісны цэнтр, паглядзець на паркоўку і адразу зразумець, што тут займаюцца не лёгкай атлетыкай і не плаваннем. Цяпер, на шчасце, многія зразумелі, што колькасць грошай не з'яўляецца вызначальным фактарам. Якія б цяплічныя ўмовы ты не ствараў дзіцяці, нічога не спрацуе, калі яно не таленавітае і не дастаткова матываванае.

Так выйшла, што і я, і Макс, і Віка з простых, небагатых сем'яў. У мяне бацька з аўтазавода, у Макса тата працаваў у вучылішчы металістаў праз дарогу ад яго дзіцячай школы. Надзя Астроўская, Таня Пучак — усе з аўтазавода. Напэўна, вось гэты фактар матывацыі і спартыўнага голаду адыгрываe вялікую ролю. Плюс трэба разумець, што свае першыя крокі мы рабілі яшчэ ў старой, савецкай школе, дзе трэнеры, як і спартсмены, хацелі даказаць, што сёння менавіта яны лепшыя. Просты прыклад — мой першы трэнер Вячаслаў Уладзіміравіч Коннік, ён абышоў практычна ўсе школы аўтазаводскага раёна, пабываў на ўроках фізкультуры, прагледзеў 2,5 тысячы дзяцей, каб адабраць свае першыя групы. І адразу з іх выйшлі я і Таццяна Пучак. Вось гэта падыход і прыклад таго, як павінна правільна працаваць селекцыя.

***— Што можна ўбачыць у дзіцяці ў школьным узросце?***

— Па-першае, адразу бачна каардынацыя. Можна вызначыць, ці ёсць рэакцыя на прадмет, які рухаецца, ці можа дзіця лавіць мяч. Спрыт таксама бачны адразу, варта даць некалькі практыкаванняў, і спартыўныя дзеці рэальна выдзяляюцца.

***— Пагаворым пра нашу галоўную «зорку» сёння. Вы з Вікторыяй Азаранка, напэўна, знаёмыя лепш, чым любы з заўзятараў. За кошт чаго, па-вашаму, сёння беларуска з'яўляецца адным з лідараў сусветнага тэніса?***

— Хацелася б, каб Віка сама больш расказвала пра сябе, але раз ужо вы спыталі... Мяне падкупляе ў ёй вялікая працавітасць, такая колькасць часу, якую яна аддае свайму целу, сваёй падрыхтоўцы... Проста ўражвае. Віка — гэта інтэлектуал, таму што трымаць каманду з трох-чатырох дарослых людзей, рабіць так, каб гэты карабель плыў, садзіць усіх за стол перамоваў і вызначаць напрамкі руху пасрэднаму чалавеку немагчыма. На мой погляд, яна па-добраму, па-спартыўнаму вельмі амбіцыйная, яна разумее, што такое вяршыня, як туды трапіць і чым для гэтага трэба ахвяраваць. Да таго ж мне здаецца, што яна — чалавек, які зараджаецца на апрацоўку новай, карыснай для сябе інфармацыі. Такое адчуванне, што ў яе ўвесь час уключаны лакатары, яна пастаянна слухае, што адбываецца навокал.

***— Як ацэніце шанцы Вікторыі на поспех у Алімпійскіх гульнях?***

— Яна прафесіянал, і агонь у яе вачах, кажа пра тое, што яна пазмагаецца за медаль.



**«Шарапава ніколі не пойдзе падманваць людзей. Гэта проста не той чалавек, яна паталагічна сумленная».**

Вікторыя вартая зноў стаяць на п'едэстале, таму што за гэтыя 4 гады яна прайшла вялікую дарогу і многае пераадолела. Спачатку ў яе быў наймагутнейшы ўзлёт на вяршыню, а потым нейкая перазагрузка, але яна знайшла ў сабе сілы, каб вярнуцца.

***— І да тэніса дабраўся гучны допінгавы скандал, у ім замяшана ваша былая падапечная Марыя Шарапава. Што скажаце на гэты конт?***

— Тут шмат супярэчлівай інфармацыі. Так, допінг быў у спорце, магчыма, ён дзесьці застаецца і будзе жыць далей, але спартсмены такога ўзроўню — не дурні. З навін мы чуем імёны велізарнай колькасці атлетаў, якія звязаны з мельдоніем, гэта проста фантастычныя лічбы. Мяне гэта насцярожвае. А што тычыцца асабіста Марыі, то я магу даць гарантыю, што Шарапава ніколі не пойдзе падманваць людзей. Гэта проста не той чалавек, яна паталагічна сумленная.

***— У вас ужо ёсць нейкі вопыт трэнерскай работы, як адчуваеце сябе ў гэтай ролі?***

— Думаю, што быць трэнерам — гэта мой лёс. Мне вельмі цікавая гэтая работа, я люблю яе і спадзяюся, што пройдзе нейкі час і ў мяне будзе шмат вучняў, якія пераплюнуць мае дасягненні. Гэта мая мара.

***— Кажуць, што добрым трэнерам можа стаць толькі той спартсмен, які не рэалізаваў свае амбіцыі...***

— Я рэалізаваў свой патэнцыял нават больш, чым мне было дадзена. Заўсёды шчыра любіў і люблю тэніс, на пэўным этапе ў мяне нават была «хваравітая» любоў да спорту, я занадта перажываў і ўсё прымаў блізка да сэрца. Гэта прымушала мяне шмат думаць і аналізаваць псіхалогію ў спорце. Я ўдзячны Богу за тое, што ў мяне быў гэты шлях у спорце, таму што ён правёў мяне праз многія жыццёвыя вопыты і ўзбагаціў велізарнай колькасцю эмоцый, адчуванняў, якія бачу і ў сваіх спартсменах. Я разумею, чым яны зараз дыхаюць і што мне ім трэба прапанаваць. Ведаеце, складана растлумачыць чалавеку, які ніколі не кахаў, што такое каханне, ці сляпому расказаць, як выглядае неба.

***— Часта ўспамінаеце сваю кар'еру?***

— Часам грашу, як і ўсе былыя спартсмены, калі дзесьці на турнірах вучні штосьці пытаюцца, а ты міжволі ўспамінаеш нейкія турніры, дзе быў сам. Своечасова стараюся сябе абсякаць, таму што адзін мой добры настаўнік сказаў: «Каб стаць добрым трэнерам, трэба забыць, што калісьці ты быў спартсменам». Трэба разумець, што цяпер ты ўжо другі нумар, ты ўжо не вядзеш, а проста паказваеш кірунак і ідзеш побач са сваім вучнем.

***— Чым займаецеся цяпер, акрамя спорту?***

— Вельмі люблю дачу, там у мяне ёсць сад, я за ім сачу, даглядаю. Для мяне гэта магутная аддушына, напэўна, нейкі кліч продкаў. Калі я прыязджаю туды хоць бы на паўтара дня, сапраўды адналюся. Акрамя гэтага, вельмі люблю чытаць кнігі — прозу і паэзію, тут таксама знаходжу аддушыну, нейкі жыццёвы вопыт разумных людзей. З аўтараў мне заўсёды вельмі падабаўся Іван Яфрэмаў, нядаўна прачытаў «Час быка». Мяне проста ўразіла, як у 1968 годзе чалавек практычна апісаў тое, што мы бачым сёння. Нядаўна з задавальненнем перачытаў «Сабачае сэрца» Булгакава, ажывіў у памяці дыялогі, якія сталі ўжо класікай...

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
lobazhevich@zviazda.by

# КРЫЖАВАНКА

**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 5**. Празмернасць, ад якой жанчыны імкнуцца пазбавіцца. **7**. Знак задыяка з закручанымі рагамі. **9**. У яго бяруць салдат праціўніка. **11**. Адзін з сяброў Чыпа з мультфільма Уолта Дыснея. **12**. Націск кнопкі мышы на камп'ютары. **14**. Гімнастка пад купалам цырка. **16**. Тара для пераноскі мядзведзем Машы і яе выпечкі. **18**. У выглядзе якой птушкі малявалі егіпецкага бога Гора? **19**. Палка з намataным на канцы прасмоленым пакуллем для гарэння. **21**. Дэталь, не патрэбная ні камізэльцы, ні сарафану. **23**. Бакавая паверхня гары. **24**. Хто з сваякоў Астапа Бэндэра «быў падданым Турцыі»? **25**. Назва гэтага хімічнага элемента паходзіць ад грэчаскага слова «цяжкі». **27**. Мегаполіс як населены пункт. **29**. Крыніца ведаў, скарбаў і прапановаў. **31**. Дзікая кошка, умее выдатна плаваць. **33**. Буйная марская жывела з васьмю вялікімі шчупальцамі. **38**. Яе мае і дуб, і мозг, і Зямля. **39**. Праява духоўнага стану ў выглядзе асаблівага арэолу. **40**. Яму пускаюць кроў з карысцю для грамадства. **41**. З чаго збіваюць таго, каго хочуць увесці ў зман. **42**. Мінерал, здольны расколвацца па роўных плоскасцях.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1**. Імя амерыканскай актрысы Гуджына. **2**. Сіла струменя вады ў кране. **3**. Верш у 14 радкоў. **4**. Што агульнага можна знайсці ў чыгунке і ў дрэве? **6**. Адносіны, у якія ўступаюць пад гукі марша. **8**. Гукавая забаўка ў лесе або гарах. **10**. Яно спачатку было нямое, а потым загаварыла. **13**. Што Адысей выкалаў цыклопу Паліфему? **15**. Загарадное месца працы пасля працы. **17**. Музычны інструмент у тры струны. **18**. Навука аб падрыхтоўцы вядзення войн. **20**. Глядзі фота. **22**. Невялікае судна для каротких плаванняў. **26**. «... галава добра, а дзве — лепш». **28**. Выпуклая плоская замкнутая крывая без заломаў. **30**. Мера вагі сумлення, вывіць якую ніяк не ўдаецца. **32**. Сплаў для адліўкі друкарскіх шрыфтоў. **33**. Куча часу ў дадатак да маленькай каляскі. **34**. Гусляр, што цару-Вадзяніку іграў. **35**. Боепрыпас, а таксама кіслы выраз твару. **36**. Круты ў нястрыманага чалавека. **37**. Сетка для адпачынку ў падвешаным стане.



Склаў Юрый ФАЛІНСКІ, *г. Мінск.*

**Праверце, калі ласка, адказы!**

**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 5**. Вага. **7**. Авен. **9**. Палон. **11**. Дэйл. **12**. Клік. **14**. Акрабатка. **16**. Кораб. **18**. Сокал. **19**. Факел. **21**. Рукаў. **23**. Схіл. **24**. Тата. **25**. Барый. **27**. Горад. **29**. Кніга. **31**. Ягуар. **33**. Васьміног. **38**. Кара. **39**. Аўра. **40**. Донар. **41**. Толк. **42**. Агат.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1**. Карла. **2**. Напор. **3**. Санет. **4**. Ветка. **6**. Шлюб. **8**. Рэха. **10**. Кіно. **13**. Вока. **15**. Дача. **17**. Балалайка. **18**. Стратэгія. **20**. Кухар. **22**. Катар. **26**. Адна. **28**. Авал. **30**. Грам. **32**. Гарт. **33**. Вагон. **34**. Садко. **35**. Міна. **36**. Нораў. **37**. Гамак.

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.40 | 21.38 | 16.58 |
| Віцебск — | 4.21 | 21.36 | 17.15 |
| Магілёў — | 4.30 | 21.28 | 16.58 |
| Гомель — | 4.36 | 21.15 | 16.39 |
| Гродна — | 4.57 | 21.51 | 16.54 |
| Брэст — | 5.06 | 21.43 | 16.37 |

**Месяц**

*Маладзік 05.06–11.06. Месяц у сузор'і Рака.*

**Імяніны**

*Пр. Івана, Ферапонта. К. Яўгеніі, Андрыяна, Антонія, Ярослава.*

## ЗАЎТРА



Фота Сяргея РАСОЛЬКІ.




**...у суседзяў**

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +24..+26°С | КІЕЎ +17..+19°С | РЫГА +21..+23°С |
| ВІЛЬНЮС +21..+23°С | МАСКВА +14..+16°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +18..+20°С |

## Даты Падзеі Людзі

**7 чэрвеня**

**1563** год — вялікі князь ВКЛ Жыгімонт II Аўгуст падпісаў новы прывілей аб ураўнаванні ў правах праваслаўных і католікаў; тэкст прывілея ўключаны ў якасці прэамбулы ў Статут Вялікага Княства Літоўскага 1566 года.

**1825** год — нарадзіўся Эдвард Францавіч Паўловіч, мастак, мемуарыст. Вучыўся ў Жыровічах, Слоніме, Слуцку. Скончыў Пецярбургскую акадэмію мастацтваў. З 1859 года выкладаў у Навагрудскай гімназіі, заснаваў там жаночы пансіён і нядзельную школу для мясцовых жыхароў, аматарскі тэатр, дзе быў рэжысёрам, дэкаратарам, акцёрам. Падрыхтаваў і выдаў каталогі фондаў музея Любамірскіх. Аўтар брашуры «Некалькі слоў літвіна», мемуараў «Успаміны з-пад Віліі і Нёмана», «З вандровак па Літве». Пісаў пра культурна-грамадскае і літаратурнае жыццё Беларусі 1840–1860-х гадоў, пра беларускага паэта Ф. Савіча, побыт беларусаў. Працаваў у жанры партрэта, выканаў замалёўкі Навагрудка і яго ваколіц, пісаў іконы. Памёр у 1909 годзе.

**1911** год — 105 гадоў таму нарадзіўся (вёска Суднікі, цяпер у Віцебскім раёне) Фёдар Анісімавіч Сурганаў, дзяржаўны і партыйны дзеяч Беларусі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў камсамольскага падполля і партызанскага руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1939–1941 гадах — сакратар Горацкага райвыканкама, першы сакратар Магілёўскага абкама ЛКСМБ. У 1942–1943-м — у складзе аператыўнай групы ЦК КП(б)Б і БШПР на Калінінскім фронце. Затым — адзін з кіраўнікоў партызанскага руху і камсамольскага падполля на тэрыторыі Вілейскай, Баранавіцкай і Беластоцкай абласцей. З 1947 года — другі сакратар Мінскага абкама КПБ, з 1954-га старшыня Мінскага аблвыканкама, у 1955–1956-м — першы сакратар Мінскага абкама КПБ, пасля — другі сакратар ЦК КПБ. Адначасова намеснік старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, намеснік старшыні Савета Нацыянальнасцяў Вярхоўнага Савета СССР, старшыня Бюро ЦК КПБ па кіраўніцтве сельскай гаспадаркай. Загінуў у аўтакатастрофе ў 1976 годзе. Яго імем названа вуліца ў Мінску.



**Было сказана**

**Артур ВОЛЬСКІ, пісьменнік:**

*«Кожны добры позірк — набыццё, а кожны злосны позірк — гэта страта».*

■ Не прапусціце!

# ПРЫГОЖЫ ПАЧАТАК...

**Конкурс прыгажосці «Міс Наваполацк — 2016» дасць старт святочным мерапрыемствам, прысвечаным Дню горада.**

— Феерыю жаночай прыгажосці можна будзе ўбачыць вечарам 7 чэрвеня ў Цэнтры культуры. Дзяўчатам даецца шанц прадэманстраваць не толькі прыгажосць, але і заявіць пра сябе як пра асобу. Членамі журы будуць ацэньвацца інтэлект, пластыка, рухаў, акцёрскае майстэрства... Прайшоўшы складаны шлях, паўдзельнічаўшы ў кастынгах, у фінале прымуць удзел 15 дзяўчат, — паведамілі «Звяздзе» ў Наваполацкім гарвыканкаме.

Акрамя вартай тытула першай прыгажуні, судзі вызначаць пераможцаў у розных намінацыях. Сярод іх: «Міс зачараванне», «Міс топ-мадэль», «Міс глядацкіх сімпатый», «Міс дружба» і іншыя.

Арганізатары падкрэсліваюць, што за гады існавання конкурсу (цяперашні пройдзе ўжо сёмы раз) дзяўчаты не раз выходзілі ў фінал прэстыжнага шоу «Міс Беларусь». І там годна прадстаўлялі горад нафтапераpрацоўшчыкаў.

У якасці вядучага конкурснай праграмы заяўлены Аляксей Грос, тэлевядучы, тэленавіты артыст эстрады. Будуць і спецыяльна запрошаныя «зорныя» госці, пераможцы розных праектаў і фэстаў.

**Карына МЯЛЕШКА**

## УСМІХНЕМСЯ

**У зоамагазіне:**

**— Дайце мне, калі ласка, вунь тую чарапашку-коніка.**

**— Чарапашку-коніка? Вой, блін, зноў забыўся выключыць падагрэў пяску ў тэрарыуме!**

Перад тым, як выпіць пятнаццатую чарку, добра падумайце, ці хочаце вы ўбачыць сябе на Youtube.

**Памятаеце, як мы сядзелі на занятках па псіхалогіі, вывучаючы сабаку Паўлава? Доўга смяяліся, якія дурныя ў яго сабакі.**

**А потым звінеў званок, і мы ішлі ў сталовую.**

— Уяўляеш, ён запомніў колер маіх вачэй!

— Калі хлопец памятае колер тваіх вачэй пасля першага спаткання, значыць, у цябе маленькія грудзі!

**У наступным месяцы я выходжу замуж. Будзе маленькая вечарынка, і запрошаныя толькі самыя блізкія... Падарункаў не трэба! Прывядзіце толькі каго-небудзь, хто ажэніцца са мной!**

Калі вы прыйшлі дадому, а ваша жонка ў слязах, то перад тым, як спытаць, што здарылася, абавязкова павячэрайце, таму што гэта надоўга.




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by; e-mail: info@zviazda.by, (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.023. Індэкс 63850. Зак. № 2316.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 6 чэрвеня 2016 года.